незалежная газета

№ 7 (605) 18 лютага 2009 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Хто наварыць на зямлі?**

Старонка 2

**Доўгая дарога агента «Бімбы»**

Старонка 8



**Доктару Хаўзу ад беларускага народу**

Старонка 11

## У НУМАРЫ

**У Беларусь прыедзе Салана**

Візіт распачнецца 18 лютага. **Старонка 4.**

**«Следство кончано, цяпер будзе суд»**

Працяг гісторыі з канфіскацыяй на беларуска-польскай мяжы 10 асобнікаў часопісу ARCHE. **Старонка 5.**

**Швед рассакрэціўся**

Шведскі сацыял-дэмакрат Урбан Алін выконваў ролю пасярэдніка паміж урадамі Беларусі і ЗША ў справе Казуліна. **Старонка 4.**

**Ад Бога ці ад малпы?**

Навукоўцы працягваюць спрачацца. З нагоды 200-годдзя з дня нараджэння Чарлза Дарвіна піша філосаф і тэолаг, манах-дамініканец Пётра Рудкоўскі. **Старонка 7.**

**«Пінская шляхта» пад Бабруйскам**

Ці ёсць сёння розніца між шляхтай і мужыкамі? Пра засценкі Фартуны і Круглоніва піша Тацяна Барысік. **Старонка 12.**

**Men's Fest**

Дзе варта быць — **старонка 14**.

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — **старонка 2**.

# Дзень святога Валянціна па-беларуску

Спецназ разагнаў моладзь, якая збіралася адзначыць Дзень закаханых не так, як рэкамендуе БРСМ. **Старонка 3.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Складаць няма куды

Прынамсі ў дзвюх галінах прамысловасці — у лёгкай і машынабудаванні — далейшая праца на склад не мае сэнсу. Праз колькі месяцаў тое самае можа стацца з вытворчасцю будматэрыялаў.

У Беларусі суадносіны запасаў гатовай прадукцыі і сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці на 1 лютага 2009 году ў фактычных цэнах склала 84,6%, альбо 5,968 трлн рублёў. На 1 лютага 2008 году гэты паказчык быў на ўзроўні 50,2%, а на 1 студзеня 2009 году — 61,1% (4,956 трлн рублёў).

Менавіта ў студзені продаж прадукцыі рэзка скараціўся. І гэта нягледзячы на прастой многіх заводаў у святочны перыяд.

**Працяг на старонцы 3.**

# Хто наварыць на зямлі?

**6 лютага Лукашэнка падпісаў указ, які дазваляе без абмежаванняў трымаць зямельныя ўчасткі.**

Указ №64 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя ўказы прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях будаўніцтва, канфіскацыі і выдзялення зямельных участкаў» скасоўвае правядзенне аўкцыёнаў пры выдзяленні зямельных участкаў юрыдычным асобам ды індывідуальным прадпрымальнікам для будаўніцтва і абслугоўвання нерухомай маёмасці, прызначаных для вытворчасці тавараў, выканання прац, аказання паслуг.

Дадзеную норму тлумачаць патрэбай «паляпшэння інвестыцыйнага клімату ў малых паселішчах і сельскай мясцовасці».

Аўкцыёны захаваюцца ў гарадах з насельніцтвам звыш 50 тысяч жыхароў, а за аблвыканкамамі замацоўваецца права выдзяляць пэўныя ўчасткі зямлі толькі паводле вынікаў таргоў.

Таксама чарговы ўказ прыпыніў дзеянне ўказу ад 7 лютага 2006 году №87 «Аб некаторых мерах па скарачэнні не завершаных будаўніцтвам незакансерваваных жылых дамоў, лецішчаў», паводле якога ўласнік цягам трох гадоў мусіць пабудавацца на набытым участку. Распрацоўшчыкі ўказу спадзяюцца, што гэтая мера «дазволіць грамадзянам, разлічыўшы свае фінансавыя магчымасці, спакойна скончыць распачатае будаўніцтва».

Гэтыя дзве перамены палягчаюць жыццё простым грамадзянам, якія будуюцца, і спрыяюць бізнесоўцам. Аднак досвед Расіі і Украіны ў гэтай сферы паказвае, што адначасова яны адкрываюць для людзей, набліжаных да ўлады, неабмежаваную магчымасць атрымаць і трымаць (няма вымогі будоўлі) перспектыўныя дзялянкі зямлі.

Адсутнасць аўкцыёнаў азначае бесканкурэнтнасць. А без патрэбы сканчаць будаўніцтва за 3 гады можна і чакаць лепшых часоў — калі крызіс мінецца і цэны на зямлю ізноў папаўзуць уверх.

**Сямён Печанко**

### Рышард Капусцінскі ў Пінску

**22 лютага а 14-й у Пінскай раённай бібліятэцы (Іркуцка-Пінскай дывізіі, 35)** адбудзецца прэзентацыя кнігі Рышарда Капусцінскага «Імперыя». У праграме імпрэзы сустрэча з перакладчыкам Яўгенам Салейчуком, выдаўцамі і рэдактарамі.



# Валянцін Тарас

Адышоў Валянцін Тарас, пісьменнік, партызан, ветэран беларускай культуры. Ён быў адным з маральных аўтарытэтаў руху за незалежнасць і дэмакратыю. Блізкі сябар Васіля Быкава, спадар Валянцін апекаваўся ягонай спадчынай.

Пісьменніка не стала 13 лютага, ён памёр ад сэрца, на якое даўно хварэў. За чатыры дні да гэтага Валянцін Яфімавіч адсвяткаваў свой 79-ы дзень нараджэння. Васіля Быкава ён перажыў на адзін дзень.

### Кніга жыцця Валянціна Тараса

**Валянцін Тарас. На высьпе ўспамінаў.** — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2007 — 606 с.




# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Мы рэкамендуем і просім чытачоў падпісвацца праз Рэдакцыю. Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

1. Яна нам выгаднейшая фінансава.

2. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

3. Лічым важным захаваць сістэму самараспаўсюду дзейнай. Лішне тлумачыць, чаму.

Цана падпіскі праз Рэдакцыю **10 000 руб. на месяц**.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 10 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перагазу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічаюць грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**Дзмітрыю В., А.Ф., Галіне Л., Наталлі Б., Яўгену Ч., Уладзіміру В., В.К., Л.Ц., Дзмітрыю С., Д.М., І.Х., В.Дз., Ю.Г., Сафіі В., Алене А., Алене М., І.Г., Генадзю К., Аляксандру А., Ірыне Ф., Аляксандру А., А.Е., Уладзіміру В., Наталлі Б.** з Гродна.

**Т.Ш., Святлане Ц., Л.Л., Л.А., Вячаславу В.** з Маладзечанскага раёну.

**Мікалаю К., Вадзіму С., Міхаілу С., Віктару Н., Валянціну Д.** з Мінскага раёну.

**Аляксандру К., Р.Р., Валерыю П.** з Баранавіцкага раёну.

# Складаць няма куды

Працяг са старонкі 1.

У сталіцы аб'ём прамысловай вытворчасці скараціўся ў студзені на 5,5% проці мінулага году нават паводле афіцыйнай статыстыкі. У краіне ж, паводле звестак Белстату, на прадпрыемствах машынабудавання і металаапрацоўкі вытворчасць знізілася на 20,2%, прамысловасці будматэрыялаў — на 20,1%. У лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці аб'ём вытворчасці знізіўся на 19,5%, у лёгкай прамысловасці — на 17,4%, у электраэнергетыцы — на 9,1%. Менш вырабілі, і ўсё адно — рост запасаў. Такім чынам, попыт на тавары знізіўся яшчэ мацней.

Найбольшыя суадносіны запасаў гатовай прадукцыі і сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці склаліся ў лёгкай прамысловасці — 196,4% (за год выраслі на 51,8%). Гэтая сфера аддаўна была праблемнай, бо не вытрымлівала канкурэнцыі з азіяцкімі вытворцамі.

Новым «цяжкім» сектарам стала цяжкая прамысловасць. У машынабудаванні і металаапрацоўцы складскія запасы дасягнулі 148,6% (рост за год на 65,8%).

Крызіс ударыў па машынабудаўніках ва ўсім свеце. Спачатку шал цэнаў на энергарэсурсы прымусіў спажыўцоў перагледзець свае прыярытэты, пачалася турбуленцыя. На яе наклаўся фінансавы крызіс: машыны і сродкі вытворчасці ва ўсім свеце набываліся пераважна ў крэдыт, цяпер гэта стала немагчыма.

У выніку магутны еўрапейскі канцэрн «Вольва» прадаў у снежні ўсяго... 168 грузавікоў. А экспарт Японіі, аснову якога складае прадукцыя машынабудавання і электронікі, упаў на 40%. Прэм'ер Сідорскі прызнаў, што і попыт на прадукцыю беларускага машынабудавання знізіўся на 30%.

Урад кінуў сродкі на ўтрыманне занятасці і абаротнага капіталу. Аднак, на жаль, Беларусь жыла не па сродках і падышла да крызісу не толькі без золатавалютных рэзерваў, але і з мінімальным антыкрызісным фондам.

Хто наступны ў чарзе на спыненне?

У лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці запасы дасягнулі 102,6% (рост на 43%). У харчовай — 92,6% (на 18,5%). У прамысловасці будаўнічых матэрыялаў — 78,8% (на 24,7%). Тут варта адзначыць, што, напрыклад, цэмент ці прадукты маюць вызначаныя тэрміны захоўвання, таму тут складскія запасы не могуць быць такімі вялікімі, як на «Белшыне» ці МТЗ.

Запасы выраслі таксама ў хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці — да 74,8% (на 36,2%), у чорнай металургіі — 46,4% (на 39,5%), у паліўнай прамысловасці — 7,2% (на 1,6%).

Беларуская гаспадарка зведвае тыя самыя праблемы, што і расійская, толькі яны назапашваюцца праз два—тры месяцы пасля таго, як праяўляюцца ва ўсходняга суседа. Гэта свайго роду закон спалучаных сасудаў.

Паводле афіцыйных звестак, ВУП Беларусі ў студзені працягваў расці, як і прамысловая вытворчасць у краіне ў цэлым. У той жа час Расія адважылася прызнаць, што падзенне прамысловае вытворчасці адбылося і ў студзені склала рэкордныя 16,6% проці таго ж перыяду мінулага году.

Спіс лідэраў падзення той самы, што і з складскімі запасамі ў нашай краіне: шыны, аўтамабілі, скураныя вырабы, ДВП, дываны, кнігі.

У панядзелак стала вядома, што пачаліся праблемы з сродкамі на мінскім «Амкадоры». Яшчэ раней перайшлі на трохдзёнку некаторыя вытворчасці МАЗу, на чатырохдзёнку — маторны завод. Можна чакаць змяншэння загрузкі і заробкаў на іншых прадпрыемствах машынабудавання і лёгкай прамысловасці.

Не прагадаюць тыя працоўныя, хто на гэтае лета абробіць стары дзедаў агарод: большасць эканамістаў сыходзіцца на тым, што эканоміка не пачне падымацца раней за 2010 год. Некаторыя ж лічаць, што цяперашні крызіс акажацца такім жа зацяжным, як калісь — Вялікая дэпрэсія, у час якой ВУП многіх краінаў скараціўся на 30—50%.

**Мікола Бугай**

# Дзень святога Валянціна па-беларуску

**Спецназ разагнаў моладзь, якая збіралася адзначыць Дзень закаханых не так, як рэкамендуе БРСМ.**

Гэта акцыя стала ўжо традыцыйнай. Ад 1997 году на Дзень закаханых сябры незарэгістраванага «Маладога фронту» абходзяць пасольствы замежных краінаў з віншаваннямі. Звычай мірнае шэсце на колькі сотняў чалавек з сцягамі і кветкамі пачыналася на плошчы Свабоды, ад французскай амбасады. Але сёлета арганізатары вырашылі змяніць маршрут. Яны прасілі ў Мінгарвыканкаму дазволіць збор на плошчы Якуба Коласа і шэсце праспектам Незалежнасці. Гэтым разам было вырашана адмовіцца і ад абыходу пасольстваў.

Гарадскія ўлады за два дні да шэсця адмовілі заяўнікам з фармальнай прычыны: забаронена ладзіць акцыі побач з уваходамі ў метро. Альтэрнатыўны варыянт прапанаваны не быў. Арганізатары ж заявілі, што шэсце ўсё адно пойдзе па запланаваным маршруце. Мінулыя гады дазволу на святкаванне таксама ніхто не даваў, але і не разганялі моладзь. Што гаварыць пра 2009 год, калі афіцыйна аб'яўлены курс на лібералізацыю.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Свята пачыналася мірна.

Напярэдадні 14 лютага ў кватэрах «маладафронтаўцаў» прайшліператрусы. Была сканфіскаваная амаль уся атрыбутыка да шэсця. Аднак дзяўчаты, ноч не паспаўшы, наноў намалявалі плакаты і расцяжкі, пашылі касцюмы і дэкарацыі. Таму натоўп, які сабраўся а 18-й на плошчы Якуба Коласа, выглядаў, як заўсёды, стракатым і святочным. Было дзве вялікія расцяжкі «Акцыя любові» і «Малады фронт», дэманстранты трымалі белыя і чырвоныя шарыкі, сцяжкі. Раздавалі кветкі, паводле якіх на пляцы Волі мусіла прайсці латарэя з прызамі. Тамсама павінен быў адбыцца і святочны канцэрт з удзелам гурту PLAN. Было нямала дзяцей. Двух малых сыноў прывёў прадпрымальніцкі лідэр Аляксандр Макаеў.

Яшчэ да пачатку шэсця маладзёны паказалі касцюмаваную сцэнку, прысвечаную Дню святога Валянціна. Пра жорсткага рымскага імператара, які, забараняў святкаваць гэты дзень, пару закаханых і святара Валянціна, які не паслухаўшы дыктатара, абвянчаў маладых, а потым быў кінуты ў вязніцу і прыняў пакутніцкую смерць.

Акторы зарабілі апладысменты. Потым на заклік Змітра Дашкевіча моладзь рушыла. Але дайсці ўдалося толькі да павароту на вуліцу Чырвоную: там стройнымі шэрагамі пашыхтаваўся спецназ. Міліцыянты былі без шлемаў, дубінак, шчытоў — у чорнай форме з голымі рукамі. Некалькі хвілінаў стракаты натоўп мітынгоўцаў і людзі ў чорным стаялі твар у твар, не робячы рэзкіх рухаў.

Потым спецназ рушыў наперад. Пачуўся трэск паламаных тронкаў ад сцягоў. Адразу павалілі на асфальт Дашкевіча, паўдзесятка «чорных» пачалі біць яго нагамі. Усё гэта адбывалася на праезнай частцы, побач з стаянкай. Хлопцам заломвалі рукі і кідалі тварамі на капоты машынаў. Білі ўсіх, і дзяўчат у тым ліку. Урэшце міліцыянты загналі ўсіх у пераход на плошчы Якуба Коласа і палічылі сваю працу выкананай.

Дашкевіча пад рукі вялі паплечнікі. Яго твар быў у крыві. «Тое, як паводзілі сябе ўлады, найлепшым чынам сведчыць, наколькі шчыры Лукашэнка і яго атачэнне. У Беларусі нічога не мяняецца. Але мы будзем і далей працаваць, змагацца, але змагацца мірнымі метадамі», — сказаў Дашкевіч.

**Зміцер Панкавец**

## СЦІСЛА

### Чыгунку рыхтуюць да прыватызацыі?

Прапрацоўваецца магчымасць акцыянавання Беларускай чыгункі. Пра гэта заявіла ў Мінску журналістам дырэктар Фонду дзяржаўнай маёмасці Дзяржкаммаёмасці Наталля Жарнасек, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

### Андрэйчанка: Беларусь разлічвае на статус спецыяльна запрошанага

Нацыянальны Сход Беларусі мог бы атрымаць статус спецыяльна запрошанага ў Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы на яе чарговай сесіі. Пра гэта заявіў старшыня палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка 16 лютага на сустрэчы з дэлегацыяй ПАРЕ ў Мінску.

### Бандарэнка: Апазіцыя сваіх не кідае

«Мы зрабілі тое, што павінны былі зрабіць Усе мусяць ведаць, што апазіцыя сваіх у бядзе не кідае», — заявіў пасля заканчэння акцыі ў падтрымку арыштаваных ваўкавыскіх прадпрымальнікаў, што прайшла ў Мінску, каардынатар ініцыятывы «Хартыя'97» Зміцер Бандарэнка.

У 18 гадзін 16 лютага прыкладна 100 чалавек сабраліся на Кастрычніцкай плошчы. Яны сталі ў ланцужок уздоўж праспекту Незалежнасці з партрэтамі прадпрымальнікаў, якія былі затрыманыя 8 лютага. З плошчы іх выціснуў амон, некаторых пабілі.

### 80% — падзенне расійскага аўтапраму

Прадпрыемствы РФ у студзені 2009 году скарацілі выпуск легкавых аўтамабіляў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага году на 79,7% да 18,2 тыс. Пра гэта гаворыцца ў паведамленні Расстату. Аб'ём выпуску грузавых аўтамабіляў скараціўся на 76,4% да 4,2 тыс., аўтобусаў — на 83,4% да 719 штук. Агулам жа ў Расіі падзенне прамысловай вытворчасці ў студзені склала 16% проці мінулага году.

### Месяц люты наробіць плюты

Цягам тыдня тэмпература будзе паніжацца. У сярэдзіне тыдня толькі ў асобных раёнах пры праясненнях слупок тэрмометра будзе апускацца да 7—12 градусаў марозу. Удзень жа марозік будзе невялічкі. А ўжо на выхадныя маразы акрэпнуць да мінус 10—15 градусаў. Будзе ясна і, як заўжды ў лютым, на сонейку на дахах будуць намярзаць ледзяшы.

### Аўстралійскі падпальшчык — беларус?

Названа імя падпальшчыка лясоў у штаце Вікторыя. Гэта 39-гадовы Брэндан Сакалюк (Brendan Sokaluk) — жыхар рэгіёну Гіпленд.

У выніку падпалаў Сакалюка загінуў 21 чалавек. А ўсяго ў выніку пажараў у Аўстраліі загінулі 189 чалавек.

Прозвішча Сакалюк, між іншага, ці то беларускае, ці то ўкраінскае.

**ЛК, АГ**

# Швед рассакрэціў сваю ролю ў справе Казуліна

Шведскі дэпутат, намеснік кіраўніка камітэту парламенту па замежных сувязях Урбан Алін выконваў ролю пасярэдніка паміж урадамі Беларусі і ЗША ў справе вызвалення палітзняволенага Аляксандра Казуліна. Такая інфармацыя паступіла ў шведскія СМІ 15 лютага.

У.Алін паведаміў, што ў «сакавіку—красавіку 2008 году» да яго звярнулася дзяржсакратар ЗША Кандаліза Райс. Адносіны між Мінскам і Вашынгтонам тады «знаходзіліся на мяжы разрыву», і кіраўніца замежнапалітычнага ведамства ЗША вырашыла зрабіць «апошнюю спробу наладзіць адносіны, каб не закрываць амерыканскую дыпмісію ў Беларусі», зазначыў ён.

У той час на пасаду намесніка памочніка дзяржсакратара па Беларусі, Малдове і Расіі быў прызначаны Дэвід Мэркел, з якім шведскага парламентарыя звязвае даўняе сяброўства. Д.Мэркел рэкамендаваў амерыканскаму ураду У.Аліна, беларускі бок і ЕС таксама прынялі яго кандыдатуру. «Я згадзіўся таму, што быў зацікаўлены, каб адносіны паміж Беларуссю і ЗША, паміж Беларуссю і ЕС наладзіліся. Я — за дыялог», — заявіў шведскі палітык.

У.Алін паведаміў, што яго пасярэдніцтва не зводзілася толькі да вызвалення А.Казуліна.

Размова ішла пра наладжванне адносінаў паміж краінамі і ўмовы адмены эканамічных санкцый з боку ЗША, растлумачэнне пазіцый кожнага з бакоў. Шведскі дэпутат зазначыў, што лятаў на «перамовы і абмеркаванні» ў Вашынгтон і Мінск. Пры гэтым ён адмовіўся раскрыць свае кантакты з беларускага боку. У ЗША палітык кансультаваўся з К.Райс, Д.Мэркелам і намеснікам дзяржсакратара па краінах Еўропы і Еўразіі Дэніэлам Фрыдам.



Сваіх беларускіх суразмоўцаў Алін не выдае.

Пры гэтым У.Алін заклікаў «не пераацэньваць» яго ролю, бо ў перамовах удзельнічала «шмат бакоў і людзей».

Сакрэтнасць сваёй місіі ён растлумачыў «тонкасцю» тэмаў, што абмяркоўваліся. У прыватнасці, А.Казулін, з якім шведскі палітык знаёмы асабіста, не ведаў пра яго місію.

«Я вельмі рады, што беларуска-амерыканскія і беларуска-еўрапейскія адносіны пачалі наладжвацца, але яны могуць быць яшчэ лепшымі», — зазначыў У.Алін. Дэпутат выказаў гатоўнасць выступіць у якасці пасярэдніка «ў будучым, калі такая будзе цікавасць з боку партнёраў».

У.Алін — член сацыял-дэмакратычнай партыі, з 1990-х гадоў мінулага стагоддзя займаецца Беларуссю, кантактуе з сацыял-дэмакратычнымі партыямі краіны. Ён вядомы ў Швецыі палітык. Паводле інфармацыі шведскай прэсы, кіраўнік МЗС Швецыі падтрымаў кандыдатуру У.Аліна. Камандзіроўкі дэпутата аплачвала яго партыя.

**Марына Рахлей, БелаПАН**

# У Беларусь прыедзе Салана



Вярхоўны прадстаўнік Еўрасаюзу ў замежнай палітыцы і палітыцы бяспекі Хаўер Салана 19 лютага наведае Мінск. Гэта значылася ў афіцыйным раскладзе еўрачыноўніка. Але варта было гэтай навіне з'явіцца ў беларускіх СМІ, як літаральна праз гадзіну на сайце Саланы адбыліся змены. З раскладу быў зняты акурат візіт у Беларусь. Канчатковае рашэнне было прынятае толькі 17 лютага.

Як стала вядома, у Мінску Салана правядзе сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам, лідэрамі апазіцыйных партый, а таксама прадстаўнікамі грамадскай супольнасці.

**Зміцер Панкавец**



Лідзія Копаня.

# Беларускі гурт не паедзе на Еўрабачанне» ад Польшчы

Фінальны тур, у якім адбіраўся прадстаўнік Польшчы на конкурс «Еўрабачання» ў Маскву, прайшоў у суботу. Перамагла ў польскім конкурсе папсы Лідзія Копаня з песняй I Don't Wanna Leave. Яна абышла дзевяцёх іншых удзельнікаў, у тым ліку і беларускі гурт Dali.

Журы паставіла беларусаў на 5-е месца, а гледачы аддалі 9-е. Яны адзначалі, што нашы выступілі слабавата.

**АГ**

# Балта-Чарнаморская дамова пра транзіт электраэнергіі адкладзеная на май

14 лютага ў Вільні ўпершыню ў гісторыі прайшла трохбаковая сустрэча міністраў замежных справаў Беларусі, Літвы і Украіны.

У ліку іншых пытанняў абмяркоўвалася пытанне пра магчымасць імпарту ў Літву украінскай электраэнергіі. Адпаведныя дамовы будуць падпісаныя ў траўні.

«Мы пераадолелі стадыю прыгожых словаў і бяздзеяння. Гэта сустрэча сведчыць пра тое, што мы сапраўды бярэмся за энергетычныя пытанні», — рэзюмаваў міністр замежных справаў Украіны В.Агрызка.

**ЗП**

# Наступная шайба Касціцына будзе залатая

Андрэй Касціцын зарабіў 100–ты бамбардзірскі бал у НХЛ, забіўшы 49–ы гол.

«Манрэаль Канадыенс» прайграў у гасцях «Ванкувэр Кэнакс» — 2:4. Аднак і ў гэтым матчы Андрэй Касціцын закінуў адну шайбу.

Гэта ягоная 20-я шайба ў гэтым сезоне і 49-я ў кар'еры ў НХЛ. А наогул у старэйшага з братоў Касціцыных 100 бамбардзірскіх балаў у НХЛ (49 шайбаў і 51 галявая перадача).

У сезоне 2005/2006 у яго былі на рахунку 2 шайбы, 1 перадача, у 2006/2007 гг. — 1 шайба, 10 галявых перадачаў; у 2007/2008 гг. — 26 шайбаў, 27 галявых перадачаў; у гэтым сезоне: 20 шайбаў, 13 перадачаў.

У ягонага брата Сяргея роўна ўдвая меней бамбардзірскіх балаў: 50 (17+33). Праўда, ён праводзіць толькі другі сезон у Нацыянальнай хакейнай лізе.

Закінуў сваю чацвертую шайбу ў гэтым сезоне і іншы беларус — Руслан Салей.

Ягоны «Каларада» перайграў «Дэтройт» — 6:5. Але «лавіны» працягваюць займаць апошняе месца ў Заходняй канферэнцыі. Што да Салея, то сёлета на яго рахунку 18 бамбардзірскіх балаў (4+14).

А наогул Руслан — найлепшы бамбардзір з беларускіх хакеістаў, якія выступалі ў НХЛ.

Ён гуляе за акіянам з 1996 г. («Анахайм», «Фларыда», «Каларада»). І за гэты час зарабіў 185 балаў (42 шайбы, 143 галявых перадачаў) — 813 гульняў.

Ва Уладзіміра Цыплакова, што гуляў за «Бафала» і «Лос-Анжэлес» было 170 (69+101) балаў у 331 матчы.



У Канстанціна Кальцова, што нейкі час выступаў за акіянам за «Пітсбург», на рахунку 38 балаў (12+26) у 144 матчах. Зараз Кастусь, любімая спявачка якога — Надзея Бабкіна, гуляе за «Салават Юлаеў».

У Міхаіла Грабоўскага, што выступае сёлета за «Таронта», 37 бамбардзірскіх балаў (16+21), прычым у гэтым сезоне — ужо 28 (13+15).

**АГ**

# 26 ператрусаў у Ваўкавыску

Колькасць ператрусаў, якія былі праведзеныя ў мінулую нядзелю ў Ваўкавыску у межах так званай «справы Аўтуховіча», значна перавышае лічбы, раней агучаныя ў прэсе. Ёсць інфармацыя, што ўсяго праведзена было 26 ператрусаў. Трэслі ўсіх, хто хоць неяк сутыкаўся з Мікалаем Аўтуховічам, піша ў сваім блогу гродзенскі журналіст Андрэй Пачобут.

# Ці аб’яднаюцца Беларусь і Украіна супраць «Газпрому»?

Супраца ў Балта–Чарнаморскім рэгіёне не заменіць інтэграцыі ў Эўразаюз. Піша **Сяргей Богдан**.

Сустрэча Лукашэнкі і Юшчанкі ў Чарнігаве выклікала вялікі розгалас. Але практыка паказвае, што інтэграцыя паміж былымі сацыялістычнымі рэспублікамі на дадзеным этапе немагчымая.

Узгадненне палітыкі дзяржаваў магчымае пры наяўнасьці трох умоваў.

Па-першае, паміж кіраўніцтвам краін павінен існаваць высокі ровень даверу. Замяніць яго можа відавочнае дамінаванне адной з дзяржаваў. Але ў выпадку Беларусі, Украіны і Балтыі ніводзін бок не мае вырашальнай переваґі над іншым.

Па-другое, павінна існаваць высокая культура выканання дамоўленасцяў.

Па-трэцяе, дзяржавы мусяць валодаць пэўнымі матэрыяльнымі рэсурсамі, што дазвалялі б ім з упэўненасцю праводзіць палітыку, разлічаную не толькі на выжыванне тут і сёння, а і на далёкую перспектыву. Бедныя краіны не яднаюцца. Удалыя прыклады інтэграцыі — гэта Еўрасаюз ды нафтавы ОПЕК, а не Афрыканскі Саюз.

Ёсць і іншы аспект, які трэба ўлічваць пры канструяванні геапалітычных схемаў — гэта процідзеянне апанентаў. «Газпром«мае шмат магчымасцяў, каб супрацьдзейнічаць узгадненню пазіцый Беларусі і Украіны. Любое ж сур’ёзнае варушэнне ў кірунку транзітнага хаўрусу, спроба ўдвух стаць «значным гульцом на транзітным кірунку» (Юшчанка), будзе ўспрынятае як пагроза дыверсіфікацыі.

Нават калі такім краінам, як Беларусь і Украіна ўдасца наладзіць супрацу па транзіце расійскіх энерганосбітаў на Захад, «Газпром» здолее збудаваць газаправоды ў абыход нашых краінаў.

«Транзітны хаўрус» можа стаць рэальнасцю толькі калі яго арганізацыяй зоймецца ЕС як такі, а не асобныя яго балтыйскія чальцы. Аднак гэта будзе ўжо не Чарнаморска-балтыйскі хаўрус Антона Луцкевіча ці Зянона Пазняка, а проста кампанент «Усходняга вымярэння» ЕС.

# Сведчу



Сучасная тэрміновая служба — гэта ўзаконеная магчымасць працяглай ізаляцыі маладых людзей з мэтай выкарыстання іх фізічнай сілы для працы. Піша з войска **Зміцер Жалезнічэнка**.

Я, Жалезнічэнка Зміцер, ад 25 студзеня 2008 году вайсковец тэрміновай службы, выказваю словы падтрымкі гвалтоўна забраным у войска ў студзені 2009 году Франаку Вячорку, Івану Шылу, Змітру Хведаруку.

Асуджаю дзеянні дзяржаўных СМІ, у прыватнасці «Белорусской военной газеты», газеты «СБ. Беларусь сегодня», Першага нацыянальнага каналу за неаб’ектыўнае асвятленне падзеяў вакол моладзевых актывістаў, забраных у войска ў абыход закону.

У той жа час выказваю падзяку незалежным медыям за ўсебаковае асвятленне сітуацыі.

Пасля году, праведзенага ў салдатах, сцвярджаю, што сучасная тэрміновая служба не ёсць сродкам абароны краіны. Па сутнасці, гэта ўзаконеная магчымасць працяглай ізаляцыі маладых людзей з мэтай выкарыстання іх фізічнай сілы для працы.

Салдаты ў войску займаюцца ў асноўным не «баявой вучобай з мэтай атрымання вайскова-ўліковай спецыяльнасці», а цяжкай фізічнаю працаю, якая не патрабуе глыбокіх ведаў.

З ліста Змітра Жалезнічэнкі ад 1 лютага, Жлобін

# «Следство кончано, цяпер будзе суд»

Атрымала працяг гісторыя з канфіскацыяй у кастрычніку мінулага году на беларуска-польскай мяжы беларускімі мытнікамі 10 паасобнікаў таўшчэзнага нумару (№ 7—8) часопісу ARCHE за 2008 год, прысвечанага ў асноўным дарасійскай гісторыі Беларусі.




25 лютага суд Маскоўскага раёну Брэсту пачне разгляд грамадзянскай справы адносна прызнання экстрэмісцкім нумару часопісу ARCHE (№ 7—8 за 2008 год).

На днях рэдакцыя часопісу атрымала экспертнае заключэнне, зробленае ўпраўленнем КДБ па Брэсцкай вобласці. Падаем усю аргументацыю брэсцкіх чэкістаў даслоўна. Выкінуць хоць слова з гэтага немудрагелістага дакументу было б недаравальна:

«Проведенным анализом установлено, что в журналах содержатся сведения, которые дискредитируют деятельность органов власти и управления Республики Беларусь, усиливают социально-политическую напряженность и противостояние в обществе, стимулируют совершение действий, направленных на организацию и осуществление массовых беспорядков, и тем самым создают угрозу безопасности Республики Беларусь в политической сфере. В частности:

— В статье «Парлямэнцкія выбары: беларуская нуда, эўрапейская інтрыга?» (автор В. Силицкий, стр. 11—16) заявляется, что «Практычная адсутнасць інтрыгі і сур’ёзных чаканняў у адносінах да бясcільных прадстаўнічых органаў і пасіўны падыход апазіцыі да выбарчых кампаніяў не пакідае грамадству іншага выбару, акрамя як прыняць загадзя падрыхтаваную прапанову ўладаў. У прыватнасці, практычна адсутнічае супраціў кампаніям датэрміновага галасавання...»;

— В материале «Выбух і шмон: беларускі міні-Асьвенцім. Круглы стол у рэдакцыі ARCHE» (стр. 17—27) содержится мнение о действующей власти, согласно которому «...за яе фасадам хаваецца маральнае разлажэньне (якое зь нядаўняй пары нават адкрыта афішуецца) і маральная карупцыя, якая ідзе нага ў нагу за звычайнай»;

— в статье «Менскія манэўры. Лукашэнка выкарыстоўвае выбары, каб здабыць рычагі ў перамовах з ЭЗ» (авторы Б. Ярабик и А. Рабальятти, стр. 28—32) констатируется, что «... улады выкарыстоўваюць выбух для ажыццяўлення сваёй звычайнай тактыкі ўціску апазіцыі, запалохваючы патэнцыйных праціўнікаў і перашкаджаючы любой апазіцыйнай дзейнасці»;

— в публикации «Памяць ахвяраў і памяць катаў» (автор А. Расинский, стр. 33—50) сотрудники органов госбезопасности и фашисты называются созниками: «Саюзьнікі — нацыст і чэкіст — схіліліся над мапай».

Вывод: содержание данных статей свидетельствует о наличии в них информации с признаками экстремистской направленности, что стимулирует протестные настроения населения и разжигает социальную рознь по политическим мотивам».

На аснове вышэйсказанага Упраўленне абласнога КДБ просіць прызнаць канфіскаваныя ў Пашкевіча асобнікі часопісу экстрэмісцкімі матэрыяламі і знішчыць іх.

Як казаў персанаж фарсу-вадэвілю Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта», станавы прыстаў Кручкоў: «Следство кончано, цяпер будзе суд». Пачатак судовага працэсу прызначаны на 25 лютага, у 9.30 гадзін.

Рэдактар ARCHE Валер Булгакаў кажа: «Мне здаецца, што для сілавікоў гэта была справа гонару давесці матэрыялы да суду. Гэта відавочная праява карпаратыўнай салідарнасці, калі памылка Мытнага камітэту не толькі не была выпраўленая, але і даведзеная да поўнага абсурду. Тыя абвінавачванні, якія высунуты супраць ARCHE, не вытрымліваюць ніякай крытыкі. Мы не зрабілі нічога антызаконнага. Разумею, што нашы шанцы выйграць значна меншыя, чым у супрацоўнікаў дзяржаўных органаў, але будзем рабіць усё, што ў нашых сілах. У дадзенай сітуацыі галоўнае не баяцца гэтых прэвентыўных запалохванняў».

Летась КДБ падобнымі экспертызамі прызнавала экстрэмісцкімі змест газет «Свабода» і «Глос знад Немна». Урэшце, суды Гродзенскай вобласці пакінулі гэтыя справы без разгляду. Цяжка спрагназаваць, што будзе гэтым разам з ARCHE.

**Зміцер Панкавец**



# Па другім коле

Чацверты палітвязень з’явіўся ў краіне цягам аднаго тыдня. Следам за ваўкавысцамі Мікалаем Аўтуховічам, Юрыем Лявонавым і Уладзімірам Асіпенкам за кратамі апынуўся асіповіцкі «маладафронтавец» Арцём Дубскі. Хлопца арыштавалі ў Гомелі, калі ён ехаў з Расіі ў Мінск для ўдзелу ў моладзевай акцыі на Дзень закаханых.

У красавіку 2008 г. Арцём Дубскі ў рамках «Працэсу чатырнаццаці» быў пакараны судом Цэнтральнага раёну Мінску двума гадамі абмежавання волі без накіравання ў ППК. У кастрычніку Дубскі папрасіў палітычнага прытулку ва Украіне. Справа суправаджалася шальмаваннем у дзяржаўных СМІ: БТ прысвяціла Дубскаму цэлы рэпартаж.

Паводле нашых звестак, Арцём Дубскі некалькі разоў наведваў Беларусь. Такім чынам можна зрабіць выснову, што гэтым разам была дадзеная канкрэтная каманда арыштаваць Арцёма.

16 лютага Дубскага перавялі з Асіповічаў у Бабруйскае СІЗА, дзе ён будзе знаходзіцца да суду. Справу вядзе следчы Русак. Адвакатам у Арцёма будзе Тамара Сідарэнка.

Тым часам арыштаваных 8 лютага ў Ваўкавыску Міколу Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенку перавялі ў СІЗА на Валадарскага. Тэрмін іх утрымання пад вартай працягнуты да 18 лютага.

**ЗП**

# І ўся каралеўская раць

11 лютага ў выставачным павільёне «Белэкспа» ў Мінску адчынілася міжнародная выстава-кірмаш «Кнігі Беларусі-2009».

Краіны-ўдзельніцы (а заяўлена іх было 25) разам з кніжнай прадукцыяй актыўна прэзентавалі сваю культуру. Ля стэнду Паўднёвай Карэі можна было на папірусным аркушы сваімі рукамі на адмысловым прыстасаванні адціснуць карэйскі алфавіт, які, паводле словаў карэйскай прадстаўніцы, «цалкам арыгінальны, зусім не падобны да кітайскага». З ізраільскай стойкі хутка разыходзілася брашура пра загадкавы «Новы год для дрэваў», які нядаўна святкавалі юдэі. Пад партрэтамі правадыра і ля залатых фаліянтаў народных эпасаў відавочна сумавалі прадстаўнікі Таджыкістану.

Як нідзе людна было ля стэнду маскоўскага выдавецтва «Время» — друкароў Святланы Алексіевіч і Васіля Быкава. Каб атрымаць аўтограф у беларускай пісьменніцы, стаяла не раўнуючы гастраномная чарга.

А як там мелася на кірмашы беларуская кніга ў святле нядаўніх заяваў намесніка міністра інфармацыі Ігара Лапцёнка пра 7-адсоткавае змяншэнне яе друку? Пісьменнік і выдавец Уладзімір Сіўчыкаў лічыць, што беларуская кніга была прадстаўленая не найлепш: «Хацелася б больш. Прыкра бачыць, як Алексіевіч і Быкава, аўтараў, якія прэзентуюць нашу культуру, прадстаўляюць небеларускія выдаўцы». Беларуская кніга на кірмашы абмяжоўвалася збольшага даведачнай літаратурай і фальклорна-краязнаўчымі альбомамі: асноўныя выдаўцы айчыннай белетрыстыкі збольшага адсутнічалі.

Затое беларуская кніга была на замежных стэндах. Славацкі стэнд сустракаў наведнікаў фаліянтам «Краіна Беларусь» Уладзіміра Арлова і Змітра Герасімовіча (хіт апошніх трох гадоў выдаваўся ў славацкім выдавецтве «Нэаграфія»). А найлепшая паводле апытання «НН» гістарычная кніга 2008 году «Магдэбургская Гароднія» Юрыя Гардзеева красавалася на стэндзе польскага выдавецтва Kolegium Europy Wschodniej.

Лявон К.,
фота Юліі Дарашкевіч


Адкрываў выставу міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч.



І што Вы тут, спадарыня Алексіевіч, панапісвалі?




Дзесяты наш дэсантны батальён.

# Ад Бога ці ад малпы?

Навукоўцы працягваюць спрачацца. З нагоды 200–годдзя з дня нараджэння Чарлза Дарвіна піша філосаф і тэолаг, манах–дамініканец **Пётра Рудкоўскі**.



«Ведаеш, Пётра, — кажа мне Брант, амерыканец з Канзасу, — амерыканскія падручнікі па гісторыі сфальшаваныя». — «У якім сэнсе?» — пытаюся. — «У іх гаворыцца, што наша Зямля мае больш за 6 тыс. гадоў, у той час як з Бібліі адназначна вынікае, што свет быў створаны Богам не больш за 6 тыс. гадоў таму».

Пазіцыя спадара Бранта ў пытанні веку Зямлі і Сусвету не з'яўляецца унікальнай. У 2005 годзе Міністэрства адукацыі штату Канзас (Kansas State Board of Education) прыняло шэраг пастановаў, якія абавязвалі школьных выкладчыкаў паказваць «слабыя бакі» тэорыі эвалюцыі і прэзентаваць тэорыю звышнатуральнае разумнае задумы (intelligent design theory) як тэорыю больш верагодную і навукова абгрунтаваную.

«Тэорыя эвалюцыі аказалася фальшывай тэорыяй, — пераконвала Кэці Марцін, прадстаўніца Міністэрства адукацыі Канзасу, падчас арганізаваных Міністэрствам слуханняў на тэму паходжання чалавека і веку Зямлі. — Тым часам тэорыя разумнае задумы [маецца на ўвазе непасрэднае стварэнне Богам усіх відаў жывых істот — П.Р.] — гэта сапраўды навуковая тэорыя, якая добра падмацавана рэлевантнымі фактамі».

Ці не сімптаматычна, што ў штаце, які геаграфічна месціцца ў самым цэнтры ЗША, перамог — хай сабе і на кароткі прамежак часу — радыкальны крэацыянізм, які настойвае на тым, што Сусвету не больш за 6000 гадоў і што «Мудры Праектант» (так крэацыяністы мянуюць Госпада Бога) непасрэдна стварыў усе жывёльныя віды.

## Скептыкі і дагматыкі

Ужытая праціўнікамі эвалюцыянізму інтэлектуальная тактыка вельмі нагадвае тактыку Сэкста Эмпірыка (ІІ ст.), выбітнага прадстаўніка *скептыцызму*. Сэкст напісаў у свой час трактат «Супраць матэматыкаў» (які часам выступае пад назвай «Супраць дагматыкаў», бо матэматыкі і былі для Сэкстуса дагматыкамі), у якім шырока абмяркоўвае погляды найбольш рэпрэзентацыйных у той час філасофскіх школаў. «Матэматыкі» як галоўны аб'ект крытыкі фігуруюць у назве трактату невыпадкова, бо менавіта яны, гэтыя *mathematikoi*, лічыліся найбольш тыповымі прадстаўнікамі *episteme*, гэта значыць, салíднай, угрунтаванай веды. Сэкстус паслядоўна, крок па кроку, этап па этапе, выкрывае прэтэнзіі «матэматыкаў» да валодання сапраўднаю ведай, паказваючы, што іх цверджанні або цьмяныя і няпэўныя, альбо ўнутрана супярэчныя, альбо проста банальныя.

Якая з гэтага выснова? А выснова такая: не трэба пераймацца інтэлектуальнымі спрэчкамі, ці то багаслоўскага, ці то навукова-філасофскага характару. Паслядоўнікі Сэкстуса, якія называлі сябе *skeptikoi* (ад *skeptomai* — дакладна прыглядаюся, даследую) прапанавалі большую ўвагу звяртаць на жыццёвы спакой і раўнавагу.

Скептыцызм можа, аднак, мець наступствам і іншага роду жыццёвую пазіцыю.

## Чым сканчаецца фундаменталізм

Прыкладна праз тысячу гадоў пасля з'яўлення «Супраць матэматыкаў» выходзіць кніжыца з не менш красамоўнай назвай «Знішчэнне філасофаў» аўтарства Аль-Газэля з Багдаду. Гэтая кніга ў многім нагадвае палемічны трактат Сэкстуса: значная яе частка ўяўляе з сябе пранікліваe даследаванне розных філасофскіх вучэнняў, якое суправаджаецца выкрыццём іх сутнаснай недасканаласці. Аніякай рэальнай веды філасофія не дае, культываванне філасофіі — гэта свайго роду самападман, ілюзія — цвердзіць Аль-Газэль, і ў гэтым плане ён паўстае як тыповы скептык. Аднак практычная выснова, якую робіць мысляр з Багдаду, ужо зусім не тыповая для класічнага скептыцызму. Філасофія — падкрэслівае ён — не толькі парожняя і бясплодная ў пазнавальным плане, яна шкодная, бо зводзіць людзей ілюзійнымі ведамі і адводзіць ад сапраўднай веды, веды, якая была аднойчы аб'яўлена Богам праз прарока Магамета, і якая ў поўным аб'ёме месціцца ў Святой Кнізе — Каране.

Радыкальныя крэацыяністы з'яўляюцца, на маю думку, сучаснай інкарнацыяй Аль-Газэля, чыя пазіцыя можа быць выражана пры дапамозе вось такой схемы: *навуковы скептыцызм > рэлігійны фундаменталізм*.

## Вераць не толькі бабулькі

Я хацеў бы звярнуць асаблівую ўвагу на значнасць першага кампаненту крэацыяніцкага падыходу. Праціўнікаў тэорыі эвалюцыі прынята прэзентаваць як закасцянелых у сваім кансерватызме рэлігійных артадоксаў, якія ніякага дачынення да навукі не маюць. Гэта далёка не так. У шэрагах антыэвалюцыяністаў сустракаем багата выбітных навукоўцаў і інтэлектуалаў. Вілем Увенэль (прызнаны аўтарытэт у галіне развіццёвых анамаліяў), Вайн Фрайр (выбітны спецыяліст у герпеталогіі), Курт Вайс (палеантолаг), Дзін Кэн'ён (фізік, экс-эвалюцыяніст) — вось толькі некалькі імёнаў аўтарытэтных навукоўцаў, якія стаяць на пазіцыях (радыкальнага або памяркоўнага) крэацыянізму. Крэацыяністы выдаюць дзесяткі, калі не сотні, часопісаў, засноўваюць і даволі паспяхова вядуць даследчыцка-адукацыйныя інстытуты. І часам аказваюць рэальны ўплыў на адукацыйную палітыку, у чым мы яскрава маглі пераканацца на прыкладзе Канзасу.

Сіла радыкальных крэацыяністаў хаваецца ў іхнім скептыцызме. Крэацыяністы з уласцівай скептыкам манерай дэмаскуюць прэтэнзіі эвалюцыяністаў на ўсяведанне і акцэнтуюць *рэальныя* праблемы і цяжкасці, з якімі тэорыя эвалюцыі мае дачыненне. А праблем у гэтай тэорыі хапае (а якая ж тэорыя іх не мае?!).

Найбольшая, бадай, праблема — гэта пытанне пра магчымасць відавых мутацый, у выніку якіх маглі б узнікаць новыя віды (у святле сучаснай генетыкі такую магчымасць цяжка дапусціць); вялікай загадкай застаецца механізм паўставання інфармацыйных часцінак (згаданы вышэй Кэн'ён распрацоўваў у свой час тэорыю біяхімічнай эвалюцыі, аднак прыйшоў да высновы, што трансфармацыя хімічных сувязяў у такія складаныя інфармацыйныя часцінкі, як РНК і ДНК, немагчымая. Гэта і абумовіла пераход Кэн'ёна на крэацыяніцкія пазіцыі).

Апроч гэтага, праблемай можа быць таксама канфлікт з т.зв. «здаровым сэнсам» (для многіх, праўда, гэта ўсяго толькі псеўдапраблема): такія сістэмы, як орган зроку ды імунная сістэма, згортванне крыві выглядаюць настолькі тонка «прадуманымі» і дапасаванымі, што патрэбна немалое псіхалагічнае намаганне, каб прымусіць сябе ўва ўсім гэтым бачыць гульню сляпых выпадковасцяў!

## Разгон для розуму

Як бачым, разгон для скептычнага розуму даволі вялікі. Многія крэацыяністы, аднак, настолькі разганяюцца ў сваім скептыцызме, што прызямляюцца ў акопах варожага навуцы і рацыянальнаму дыскурсу рэлігійнага фундаменталізму. Як Аль-Газэль, так і ідэйныя антыэвалюцыяністы стартуюць ад выкрыцця недасканаласцяў процілеглае тэорыі, аднак робяць гэта такім чынам, каб стварыць эфект «голага караля» (альбо, можа, «голай каралевы»). І тут немалую паслугу аказваюць самі эвалюцыяністы, якія нярэдка абсалютызуюць тэорыю эвалюцыі, робяць з яе альфу і амегу навукі. На гэтым фоне ўсякае выкрыццё яе дэфектаў можа ўспрымацца (і сапраўды многімі ўспрымаецца) як доказ яе псеўданавуковага характару.

Ад недасканаласці і праблемнасці тэорыі эвалюцыі крэацыяністы плаўна пераходзяць да намёкаў, што дадзеная тэорыя — ілюзія, якая замінае прыняццю і разуменню «праўдзівай тэорыі», аб'яўленай у Кнізе Быцця...

І тут карысным будзе прыгадаць, чым скончылася «знішчэнне філасофаў» у арабскім свеце. Пад канец ХІІ стагоддзя каліф Аль-Мансур асуджае філасофскую дзейнасць Авероэса, аднаго з найвыбітнейшых мысляроў і асветнікаў таго часу, і выганяе са свайго каліфату. Ад гэтага моманту філасафаванне будзе ў ісламскім свеце жорстка пераследавацца як праява бязбожнасці і свавольства, а інтэлектуальная незалежнасць будзе зведзена да мінімуму. Арабскі свет, які ў Х—ХІІ стст. быў лідэрам у культуры і філасофіі, у выніку стаў няздольным да культурна-цывілізацыйнага прагрэсу.

Рэлігійны фундаменталізм — ці то мусульманскі, ці хрысціянскі, ці яшчэ які — з'яўляецца заганнай пазіцыяй таксама з багаслоўскага гледзішча, бо грунтуецца ён на звядзенні Божага Слова да чалавечага слова. Літаральнае прачытанне Кнігі Быцця (з чым і звязана катэгарычнае непрыняцце тэорыі эвалюцыі) з'яўляецца асобным выпадкам такога звядзення.

## Біблія — даслоўнасць ці сімволіка?

Біблія — гэта космас *сімвалаў*. Мы сустракаемся з сімваламі для таго, каб ісці далей і глыбей, у кірунку больш глыбокага сэнсу, які непасрэдна нам не даступны. Атаясамленне біблійнага сэнсу з паверхняй сімвала непрымальнае з багаслоўскага гледзішча. Ужо ў першыя стагоддзі хрысціянства Айцы Царквы заклікалі да «духоўнага» прачытвання Бібліі, гэта значыць, выхаду па-за літаральны сэнс. Дык чаму некаторыя хрысціяне ў ХХІ стагоддзі так упарта трымаюцца літаральнага сэнсу Кнігі Быцця?

* * *

Фундаменталізм характэрны не толькі для крэацыяністаў. Сярод зілотаў тэорыі эвалюцыі нямала такіх, хто гатоў накласці «анафему» (у выглядзе выключэння з універсітэту, адмовы ў публікацыі, публічнага знеслаўлення) на кожнага, хто выступае з крытыкай на адрас тэорыі эвалюцыі. «*Памятайце, што справа не толькі ў тым, каб трымаць крэацыянізм далёка ад школ, але таксама, каб гарантаваць, што тэорыя эвалюцыі будзе выкладацца ў школах адпаведным чынам, без якіх-кольвечы засцярог тыпу таго, што гэта, маўляў, «толькі» тэорыя*», — заклікае ў сваім артыкуле Глен Бранч. Абсалютызацыя тэорыі эвалюцыі нярэдка спалучаецца з інструментальным яе выкарыстаннем для прапаганды атэізму (Рычард Доўкінс).

Эвалюцыянізм, як тое слушна заўважае Карл Попер, спрычыняецца да навуковага прагрэсу, бо надае супольны кірунак прыродазнаўчым даследніцкім праграмам. Будучы часткай навуковага дыскурсу, яна застаецца адкрытай на розныя светапоглядныя інтэрпрэтацыі, як тэістычныя, так і атэістычныя. Эвалюцыянізм, насуперак дэмагагічным запэўненням Доўкінса, не прадугледжвае атэізму.

Тэорыя эвалюцыі, як і ўсякая іншая навуковая тэорыя, можа быць памылковаю. На дадзены момант яна найлепш спасярод іншых магчымых тэорый тлумачыць з'явы ў біясферы, але мы не ведаем, які будзе яе лёс праз 100 або 500 гадоў. І няма гарантыі, што ў нейкай будучыні тэорыю Дарвіна не спаткае лёс, што спаткаў іншыя тэорыі, якія ў свой час лічыліся непарушнымі і канчатковымі, напр., тэорыю Пталамея ў астраноміі або тэорыю Арыстоцеля ў фізіцы. Інакш кажучы, тэорыя эвалюцыі — не канец эвалюцыі навукі.

# Доўгая дарога агента «Бімбы»

**Спачатку «Бімба» партызаніў супраць саветаў. Пасля знішчаў сваіх сяброў па партызанцы. А пасля стаў святаром? Літоўскія следчыя падазраюць знакамітага ксяндза з Мосару Юозаса Бульку ў тым, што ён быў агентам–баевіком МГБ. Ён усё адмаўляе. Карэспандэнт «НН» пабываў у віленскім Цэнтры даследаванняў генацыду і супраціву жыхароў Літвы і ў Мосары.**



**Літоўскія гісторыкі мяркуюць, што на гэтым партызанскім здымку (1949 г.) Юозас Булька стаіць крайні справа. Ягоны брат — побач.**



**Магчыма, гэта Юозас Булька «Скраюнас», 1949 г.**

У дасье МГБ ён праходзіў як «Бімба». Гэта быў, агент-баявік, якіх засылалі ў шэрагі партызанаў, каб раскладаць і падстаўляць іх пад удары. Згодна з сакрэтнымі данясеннямі, з непасрэднай дапамогай «Бімбы» на працягу 1951—1953 гг. у выніку спецаперацый былі захопленыя і знішчаныя каля 45 партызанаў. Як непатрэбныя сведкі, гінулі і мірныя людзі. Сакрэтныя дакументы сведчаць пра тое, як гэта рабілася.

Пад аблічам партызана агенты ўваходзілі ў давер да «лясных братоў» ці вясковых жыхароў, вызнавалі ўсё да драбніцаў. А тады наляталі спецчасткі. Калі мэтай аперацыі была ліквідацыя партызанаў, гэтую задачу найчасцей даручалі менавіта агентам.

Органы дзейнічалі вынаходліва. Вось адна з сітуацый: эмгэбісты захапілі падазраваную ў сувязях з падпольшчыкамі вясковую настаўніцу. Білі, выбівалі, але допыт нічога не даў. Тады жанчыну павезлі ў невядомым кірунку. У дарозе абоз атакавалі «лясныя браты», жанчыну захапілі і пачалі дапытваць — што яна робіць разам з карнікамі, ці не працуе на іх. Тая паклялася, што не супрацоўнічала, а наадварот — дапамагала партызанам. «Не верым, дакажы. Каму і дзе дапамагала? Дай кантакты». Тая расказвае. У той жа дзень усе названыя ёй людзі гінуць ад куль эмгэбістаў. Налёт на абоз быў інсцэніроўкай...

У Літве пасля вайны і аж да смерці Сталіна ішла сапраўдная вайна.

Далёка не ўсе літоўцы прызналі савецкую ўладу, разглядаючы яе як акупацыю сваёй незалежнай краіны.

Для саветаў любое іншадумства было злачынствам. Адзін да васьмі — такі быў кошт супраціву. Паводле савецкай статыстыкі, ахвярамі літоўскіх падпольшчыкаў і партызанаў сталі каля 25 000 вайскоўцаў і актывістаў. У сваю чаргу, у Літве было забіта, расстраляна, дэпартавана каля 200 000 чалавек.

Літоўская антысавецкая партызанка была адной з наймацнейшых у Цэнтральнай Еўропе — нароўні з украінскай.

Гэта быў суровы час. Вайна супраць чужынцаў перайшла ў грамадзянскую, калі брат ішоў на брата, камуніст на каталіка, а млынар — на бедняка.

Незалежная Літва не прызнала законнасці савецкай акупацыі 1940 году. Больш за тое, з улікам колькасці ахвяраў і памеру шкоды, нанесенай краіне, падзеі тых гадоў трактуюцца як генацыд літоўскага народу. Адпаведна, згодна з літоўскімі законамі, супрацоўніцтва з савецкімі карнымі органамі разглядаецца як злачынства, якое не мае тэрміну даўнасці. Калі чалавек проста «стукаў» у КГБ у 1970-я, гэта пазбаўляе яго права займаць дзяржаўную пасаду. Калі ж у яго на руках кроў людзей — гэта фармальна можа быць нават падставай для судовага разбіральніцтва. Гісторыя агента «Бімбы» адносіцца да апошняга варыянту.

### Агент «Бімба»

Для пошукаў звестак пра былых баевікоў МГБ супрацоўнікі Цэнтру даследаванняў генацыду і супраціву жыхароў Літвы (LGGRTC) выкарыстоўваюць архівы Літоўскага КГБ і іх папярэднікаў. Там гэты гіганцкі збор праходзіць сістэматызацыю і аналіз.

На сёння справа з матэрыяламі на агента «Бімбу» налічвае некалькі сотняў аркушаў — даведак, аператыўных зводак, падсобных картак.

«19 сакавіка 1951 году пры правядзенні чэкісцка-вайсковай аперацыі ў Швянчоняляйскім раёне каля чыгуначнай станцыі Кяўнелішкі быў выяўлены бандыцкі лагер, бандыты, якія там знаходзіліся, аказалі ўзброены супраціў. У перастрэлцы былі забітыя 6 бандытаў, а «Бімба» быў захоплены жывым і тут жа даў згоду паказаць вядомы яму бункер. Пры выяўленні бункеру, бандыты, якія ў ім знаходзіліся, аказалі ўзброены супраціў і былі забітыя».

Гэта радкі з даведкі на агента «Бімбу» (асабістая справа № 1085) пад грыфам «совершенно секретно» за 1953 г.

Гэта ўсё сухая мова архіваў. А ў жыцці? Далі пад дых, далі па пысе, тыцнулі носам у лужыну яшчэ цёплай крыві: або ты нам паказваеш, дзе сядзяць астатнія, або табе капец. Хлопцу 26 гадоў, з якіх сем ён прасядзеў у лесе, і ўсё ягонае кароткае жыццё праносіцца ў яго перад вачыма...

Ёсць зафіксаваны дакументальна выпадак, калі, у часе эмгэбісцкай атакі на бункер, адзін з партызанаў паспрабаваў застрэліцца, але толькі цяжка параніў сябе. Астатніх забілі. Чэкісты яго выхадзілі і шантажом прымусілі супрацоўнічаць.

У іншым дакуменце — аператыўнай зводцы аб выніках барацьбы з нацыяналістычным падполлем і ўзброенымі бандамі па Віленскай вобласці за сакавік 1951 году — удакладняюцца звесткі пра забітых ў баі пад Кяўнелішкамі партызанаў і захопленага жыўцом «бандыта». З яго вынікае, што захопленым быў упаўнаважаны аддзелу сувязі штабу акругі «Вітаўт», камандзір бандраёну «Кяўнэ» Булька Юозас, 1925 году нараджэння, ураджэнец вёскі Рыпайчы Швянчоняляйскага раёну, у бандзе з 1948 году, партызанскія мянушкі «Скраюнас» і «Сваюнас».



гм.3

58

Совершенно секретно

С П Р А В К А
на агента "БИМБА", личное дело № 1085.

"БИМБА" - ____________ Юозас Винцевич, 1925 года рождения, уроженец дер.Рипайчи, Швенчионельского района, Вильнюсской области, Лит.ССР, литовец, беспартийный, гражданин СССР, образование незаконченное среднее, из крестьян-середняков, бывший участник вооруженного националистического подполья, в агентурную сеть завербован в 1951 году.

"БИМБА" с 1948 года находился в банде вооруженных литовских националистов, исполнял обязанности уполномоченного по связи т.н. штаба округа "В...", действовал под кличкой "СКРАЮНАС".

19 марта 1951 года при проведении чекистско-войсковой операции в Швенчонельском районе около железнодорожной станции Кяунелишкис был обнаружен бандитский лагерь, находившиеся в нем бандиты оказали вооруженное сопротивление. В ходе перестрелки было убито 6 бандитов, а "БИМБА" был захвачен живым и тут же дал согласие показать известный ему бункер. При обнаружении

**«Зусім сакрэтна». Даведка на агента «Бімбу».**

З дакументу вынікае таксама, што ў тым баі загінуў брат Юозаса Антанас Булька, 1931 году нараджэння, рэдактар падпольнай газеты «Аукштайчу ковас», партызанскія мянушкі «Дайнюс» і «Куршэнас».

Бульку пакідаюць у жывых.

Скончаецца дзейнасць ляснога брата «Скраюнаса», пачынаецца жыццё «Бімбы».

У эмгэбісцкіх дакументах, датычных «Бімбы», ёсць разнабой. Дата нараджэння пазначаецца то 1923-м, то 1925-м, а то і 1928-м годам. Недзе ягонае імя па бацьку значыцца як Антанасавіч, недзе Вінцавіч.

Уценская энцыклапедыя піша, што МГБ завербавала Бульку ў кастрычніку 1948 году. У некаторых эмгэбэшных дакументах гэты год значыцца як пачатак антысавецкай дзейнасці агента. Агульнае, што ў біяграфіі «Бімбы» ядные ўсе крыніцы — гэта мясцовасць, з якой ён паходзіць, — вёска Рыпайчы Уценскага раёну, наяўнасць брата Антанаса, а таксама падпольныя мянушкі.

Паводле архіўных дакументаў, дзейнічаў агент «Бімба» да 1961 году. Характарызаваўся як дасведчаны, дысцыплінаваны і ініцыятыўны супрацоўнік. Згодна з сакрэтнымі данясеннямі, з непасрэднай дапамогай «Бімбы» на працягу 1951—1953 гг. у выніку спецаперацый былі захопленыя і знішчаныя каля 45 партызанаў. Як непатрэбныя сведкі гінулі і мірныя

людзі.

22 сакавіка ў Лабанарскім лесе каля в. Лігялаўкі пры ягоным удзеле былі застрэленыя 13 баевікоў і захопленыя партызан і сувязная. У хуткім часе на ўказку «Бімбы» схопленыя яшчэ каля 10 мясцовых жыхароў, што дапамагалі партызанам.

У ноч з 10 на 11 красавіка 1951 г. чэкісцкая вайсковая група, кіраваная стар. лейтэнантам В.Сташкевічам, складзеная з агентаў-баевікоў упраўлення 2-N МГБ ЛССР, у сядзібе Юозаса Чыбіраса — жыхара в. Страздай Таўрагнскага сельсавету Уценскага раёну — застрэліла 11 партызанаў. Разам забітыя маці гаспадара Марцэля Чыбірэне і яшчэ адна жанчына, Тафіля Цыонялене, а таксама 10-гадовы хлапчук. Як непатрэбных сведкаў забілі і гаспадара сядзібы Юозаса Чыбіраса, і ягоную цяжарную жонку Паўліну Чыбірэне.

І гэтак далей да 1953 году... Варта адзначыць, што Бімба не быў энтузіястам — у справе няма справаздачаў, складзеных ім асабіста.

Супрацоўніцтва было спынена ў 1961 годзе «праз адсутнасць сувязі з агентам»!

Літоўскія СМІ сталі пісаць пра агента «Бімбу» з сярэдзіны 1990-х. Пры гэтым часта адназначна сцвярджаецца, што былы баявік — гэта ксёндз Булька з Мосару, што на Глыбоччыне. У 2003 годзе літоўскі тэлеканал LTV агучыў вытрымкі з тэлефоннай размовы з Ю.Булькам, у якой той заявіў, што нікога не выдаваў, а партызаны патрапілі ў рукі спецслужбаў з прычыны нізкай дысцыпліны і п'янства. Трэба сказаць, што з 1960-х Ю.Булька браў актыўны ўдзел у антыалкагольных кампаніях у Літве. Сёння ж ён вядомы як адзін з самых прынцыповых змагароў з п'янствам у Беларусі.

Супрацоўнікі Цэнтру не такія катэгарычныя, як літоўскія журналісты. «Мы амаль упэўненыя, што ксёндз з Мосару і ёсць агентам «Бімбам», гэтаму ёсць шмат дакументальных пацверджанняў, але справа яшчэ не закрытая і патрабуе канчатковага даследавання», — кажа загадчык спецаддзелу Цэнтру Рытас Нарвідас. Паводле літоўскага заканадаўства, Цэнтр толькі збірае матэрыялы, а затым перадае справу ў Пракуратуру.

## «Узяць на плечы крыж і пайсці ў Літву»

Ксёндз Юозас Булька факт свайго супрацоўніцтва з органамі адмаўляе: «Не працаваў! Што вы шукаеце? Што вы ад мяне хочаце, скажыце? Восемдзесят чацвёрты год. Не даяце спакойна памерці. Чаму вы не даследуеце, хто рэзаў у той час людзей, самагонку гнаў? Я ні з кім ні ў лесе не быў звязаны, ні ў КГБ, я вёў барацьбу з алкагалізмам. (...) Я непітушчы. Самагон выліваў, не даваў піць. А што вы ведаеце, малады, што выраблялі тым часам гэтыя бандыты, каторыя, кажуць цяпер, патрыёты? КГБ, знаеце. Я нікому прысягі не даваў. Я і цяпер працую з п'янствам. Вяду размовы. Я рады, калі чалавек папраўляецца, калі прыходзіць і дзякуе за гэта».

Айцец Юозас заўважна хваляваўся, бо сама тэма гутаркі яму вельмі балючая. «Кажуць, што з органамі супрацоўнічаў, але чаму тады яны не заступіліся за мяне, калі мяне выгналі з тэхнікуму за тое, што ў касцёл хадзіў?» — пытае Юозас Булька.

Нібы ў супрацьвагу апублікаваным у Вільні эмгэбэшным дакументам, ён дэманструе кнігі водгукаў з прадпрыемстваў, дзе ён працаваў. У іх на розных мовах запісаныя падзякі таварышу Бульку за арганізацыю цудоўных сустрэчаў, так званых безалкагольных вечароў. Запісы па-расійску зробленыя жыхарамі Ленінграду, Ульянаўску, Уральску.

У адной з гэтых кніг захоўваецца ліст жанчыны, якая дзякуе старшыні арганізацыі Чырвонага крыжа віленскага заводу электрапрыбораў Юозасу Бульку за ўратаванае жыццё. Жанчыне трэба было рабіць складаную аперацыю, якая амаль не пакідала шанцаў выжыць. Булька на свае грошы набыў дарагія лекі, і кабета, маці дваіх дзяцей, адужала.

«Я ўсё жыццё ратаваў людзей з бяды. І працягваю гэта рабіць цяпер. Можа, мяне хто і не любіць, але я не баюся. Не баюся смерці. Я сам адчыняю дзверы ўсім, хто да мяне прыходзіць, і пры гэтым не ведаю, хто стаіць на парозе», — кажа святар.

«Не падабаецца некаторым, што мяне Лукашэнка ўзнагародзіў», — узгадвае святар. І кажа, што ніхто яго не фінансуе — на ўсе патрэбы людзі ахвяруюць. «Кажуць, што Парыж* быў адноўлены не проста так. Але гэта зайздрасць людская. Трэба працаваць, шмат працаваць і тады ўсё ўдасца».



Пробашч касцёлу Святой Ганны ксёндз Юозас Булька.

Людзі судзяць адзін аднаго і хай судзяць, але ўсё адно Бог усё паставіць на свае месцы, кажа святар. «Часам у мяне ўзнікае думка — узяць на плечы крыж і пайсці пешшу ў Літву», — кажа ён.

## «Невядома, як бы я сябе павёў у той сітуацыі»

На Глыбоччыне пра расследаванне літоўскіх гісторыкаў вядома з моманту выхаду тэлеперадачы на LTV. «У нас шмат хто глядзіць літоўскія тэлеканалы, таму людзі ў курсе гэтых падзей», — кажа глыбаччанін Яраслаў Берніковіч. Ён мяркуе, што датычнасць святара да падзеяў мінулай вайны відавочная, а таму ён мусіць пакаяцца. Бо інакш чаму я мушу спавядацца такому ксяндзу, пытае Берніковіч.

Кінакрытык Андрэй Расінскі неаднаразова быў госцем Міжнароднага каталіцкага фестывалю хрысціянскіх фільмаў «Магніфікат», што ладзіцца ў Глыбоцкім раёне. Ён не можа паверыць у звестку пра стваральніка мосарскага цуду: «Патрапіўшы туды, убачыўшы ўсё на свае вочы ды паразмаўляўшы з Булькам, які столькі добрага зрабіў, у такое цяжка паверыць».

Перакладчык з Пінску Яўген Салейчук быў аднойчы з каталіцкай пілігрымкай у Мосары. «Усе мы былі моцна ўражаныя ўбачаным, але найбольш самім ксяндзом», — узгадвае ён. Адно з наймацнейшых уражанняў — тое, як да святара раніцай прыйшлі калгаснікі і пачалі раіцца, з чаго пачынаць працу. І ксёндз ім раздаваў заданні, нібы аграном. «Непрыемна такое чуць пра такога чалавека. І тым больш складана судзіць яго, бо невядома, як бы я сябе павёў у той трагічнай сітуацыі».

Колькі гадоў таму, кажа кіраўнік спецаддзелу LGGRTC Рытас Нарвідас, у пракуратуру Беларусі быў накіраваны зварот ад літоўскіх калегаў з просьбай зладзіць допыт мосарскага ксяндза. Але зварот застаўся без адказу.

Справа агента «Бімбы» не мае тэрміну даўнасці, пакуль яна часова прыпыненая, бо не апытаны галоўны падазраваны. «На сёння стаіць пытанне не столькі пакарання былых агентаў, колькі спробы не даць грамадству забыцца на гэтую трагічную і няпростую тэму», — кажа загадчык спецаддзелу. На яго думку, узрост і статус ксяндза з Мосару нельга ігнараваць. «Магчыма, яго і не трэба цягнуць у суд, але было б добра, каб ён добраахвотна выказаўся на гэтую тэму. Каб у гэтай справе можна было нарэшце паставіць кропку».

**Сямён Печанко**
**Вільня—Мосар—Мінск**

* Парыж — вёска ў Пастаўскім раёне, якая вярнула сабе гэтую назву дзякуючы намаганням айца Юозаса ў 2006 г. За саветамі вёску перайменавалі ў Навадруцк. Тут ёсць музей Яна Паўла II, а таксама ўмоўная паменшаная копія Эйфелевай вежы.



СЯМЁН ПЕЧАНКО

Сотні людзей наведваюць Мосар, у якім ксёндз Булька стварыў чароўны парк.

## Падрыхтоўка да ЦТ па-гомельску

**Некалькі месяцаў таму Гомельскаму аблана прыйшло ў галаву, што неабходна палепшыць паказчыкі ЦТ, а палепшыць іх можа, толькі калі спусціць з настаўнікаў апошнюю скуру. І паехалі настаўнікі, асабліва з глыбінкі, у Гомель — здаваць тэсты па ЦТ, прычым заваблівалі іх туды выключна падманам, нібы на кансультацыю.**

Далей — горай. Па вобласці ўпарта цыркулююць чуткі пра самагубства настаўніцы расійскай мовы адной з вясковых школ, якую літаральна гэтым тэставаннем давялі. Зрэшты, інфармацыя гэтая не пацверджаная — ніхто нічога не ведае. Справа ў іншым.

Знайшоўся хтосьці адважны і пажаліўся ў Міністэрства адукацыі, і вось тут і высветлілася, што гэта — самаўпраўства мясцовых уладаў, а канкрэтна — гомельскіх. І тэставанню настаўнікаў далі задні ход.

Праўда, на днях школы Рэчыцы атрымалі ўказанне прымусіць настаўнікаў падпісацца, што яны апавешчаныя і не супраць таго, што ў іх службовыя інструкцыі і калдамову будзе ўнесены з 13.03.2009 такі пункт: «Настаўнік нясе асабістую адказнасць за вынікі ЦТ».

І адпаведна, хто гэта не падпісвае — дадзеныя будуць адпраўленыя ў аддзел кадраў, і рабіце, кантрактнікі, высновы!

Калі ў такога настаўніка дзіця здасць ЦТ на нізкі бал, настаўнік увесь наступны год не будзе атрымліваць ні прэміі, ні даплаты, пытанне будзе вырашацца аж да адпаведнасці пасадзе.

У выніку школьнай рэформы дзеці два гады праходзяць за адзін, праграмы зрэзалі, знявечылі, тэставанне не адпавядае школьнай праграме на 80%, падручнікаў бракуе, а электронныя версіі не ўсім даступныя, бо няма кампутараў, і цяпер такі ціск на настаўніка, абы падняць лічбы.

Хацелася б ведаць, наколькі гэтае самаўпраўства мясцовых прадстаўнікоў адукацыі адпавядае працоўнаму заканадаўству?

**Алена, Гомельская вобласць**

**Ад Рэд.** Мы звязаліся з педагогамі Рэчыцы. Факты, выкладзеныя ў лісце, пацвердзіліся.

## «Белсат»: нашто такі дубляж?

**Кажуць «Рыжков», пішуць «Шышкоў».**

Глядзеў фільм Хашчавацкага па «Белсаце». Вялікі, дарэчы, дзякуй ім і за сам канал, і за паказ таленавітых фільмаў у прыватнасці. Глядзім — не адарвацца!

Вось толькі гэтым разам моцна насмяшыў дубляж. Фільм па-расійску, а субтытры па-беларуску. Лукашэнка кажа ў кадры: «Мяне добра знаў старшыня Савету Міністраў Рыжкоў». А ў субтытрах замест «Рыжкоў» пішуць «Шышкоў». І так спрэс...

Прычына ясная — не мелі сцэнарных лістоў, пісалі субтытры з голасу. Ды рабіў тое малады чалавек, які ў СССР не жыў. На будучыню трэба ўлічваць гэты аспект. Фільмы пра савецкія і постсавецкія часы няхай перакладае чалавек старэйшага пакалення.

**Віктар Гармаза, Мінск**

## Машэраў пар. Лукашэнка

**Цяпер, калі кіраўнік краіны задумае наведаць які-небудзь кут, яго апрычнікі наперад як саранча аблазяць усе куткі, заварацць усе люкі,** загадаюць завесіць шторамі вокны на вуліцу, а «стражаў парадку» будзе больш за простых грамадзян. А вось, помніцца, Машэраў быў зусім інакшы. Ніякіх «мерапрыемстваў» не праводзіў — проста сустракаўся з людзьмі.

Мне пашчасціла назіраць, як аднойчы на стадыёне прызямліўся верталёт, з якога выйшаў Машэраў. Да яго сталі падыходзіць людзі, і ён ім усім усміхнуўся, паціснуў рукі, а калі падышлі кіраўнікі раёну, ён з імі падняўся ў верталёт, пагутарыў, а потым развітаўся і паляцеў. Проста, без тэлебачання і помпы, без расходаў на ахову і «падрыхтоўку» візіту.

Вось чаму яго памятае і любіць просты народ Беларусі.

І яшчэ. Набліжаецца гадавіна Плошчы імя Каліноўскага, і я прапаную паўтарыць здымак у колеры, на якім юнак з бел-чырвона-белым сцягам едзе на даху аўтобуса. Гэта сцэна знята ў фільме «Плошча», і кожны раз, калі я бачу яе, міжволі сціскае сэрца.

Прашу прабачэння за маю беларускую мову, бо я расіец, у школе мову не вывучаў, а маімі настаўнікамі былі Караткевіч, Быкаў, Арлоў, Севярынец.

**Уладзіслаў Хархардзін, Верхнядзвінск**



**Кацярына Юр'ян на ганку свайго дому ў Расонах. Тут, у маці К.Юр'ян, перад вайной кватараваў настаўнік Пётр Машэраў, а сама яна вучылася ў Машэрава.**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

## КРЫЖАВАНКА



**Па гарызанталі: 4.** Беларуская пісьменніца, што друкавалася ў «Нашай Ніве» пачатку XX ст. пад псеўданімам Мірко. **10.** Этнограф, фальклярыст, археолаг, стваральнік «Беларускага зборніку» — энцыклапедыі побыту і культуры беларусаў дарэвалюцыйнага часу. **11.** Знакаміты савецкі тэатральны актор беларускага паходжання, сапраўднае прозвішча Шверубовіч. **12.** Рэжысёр першага беларускага мастацкага фільму «Лясная быль». **13.** Кіраўнік Дзяржаўнага вандроўнага тэатру (1926), першы Народны артыст Беларусі. **14.** Селянін, які завёў атрад беларуска-польскай шляхты ў непраходны лес. Ці існаваў напраўду — невядома. **15.** Тэрыторыя на ўсходзе Расіі, традыцыйнае месца высылкі беларускіх паўстанцаў у XIX і XX стст. **16.** Бацька «Чорнага квадрату». **18.** Падручнік для вучняў 1, 2, 3-га класаў, яго напісаў у эміграцыі ў Рэгенсбургу (Баварыя) Міхась Міцкевіч (брат Якуба Коласа). **19.** Багаты ўдавец з камічнай оперы беларускага кампазітара Яна Голанда «Чужое багацце нікому не служыць». **26.** Надзейнае месца ў Нясвіжы, дзе Радзівілы зберагалі радавыя скарбы падчас ваенных нашэсцяў. **29.** Горад, які ў 1428 г. акружылі войскі Вялікага Княства Літоўскага, каб спагнаць выкуп з Ноўгараду. **30.** Чэмпіён зімовай Алімпіяды-2002 па фрыстайле беларус Аляксей Грышын як спартсмен, што займаецца спартыўнай гімнастыкай на лыжах. **31.** Народны мастак Беларусі, аўтар «Партызанскага вяселля». **32.** Адзін з элементаў шляхецкага герба продкаў Янкі Купалы. **33.** Праца Казіміра Семяновіча «Вялікае мастацтва артылерыі». **40.** Салістка тэатра оперы і балета ў Мінску, першая выканаўца шмат якіх твораў беларускіх кампазітараў. **42.** Упрыгожанне маскоўскага Смаленскага сабору Новадзявочага манастыра, створанае групай пад кіраўніцтвам шклоўскага майстра Кліма Міхайлава. **43.** Дзяўчына з Палесся з аднайменнай оперы Яўгена Цікоцкага. **44.** Скульптар, лічыў сябе «беларускім панам», аўтар помніка Хмяльніцкаму ў Кіеве. **45.** Віцебскі князь, Альгердаў цесць. **46.** Маладая літаратарка з Магілёва, піша пад псеўданімам Анка .... **47.** Пасада, якую займаў у БАТЭ Аляксандр Ермаковіч. **48.** Радзівілаўскі, а не хлеб. **49.** Цудоўная паэтка з Белаазёрску.

**Па вертыкалі: 1.** Актор Купалаўскага тэатру. Пустарэвіч у «Паўлінцы», Дзед Даніла ў «Сымону-музыку». **2.** Ураджэнец Мсціслава, стваральнік унікальных маёлікавых рэльефаў для Успенскай царквы (Масква, 1691 г.). **3.** Аўтар першага слоўніка беларускай мовы. **5.** Сябра Рады БНР, удзельнік абвяшчэння незалежнасці. Умовіў бацьку Балаховіча перайсці на беларускі бок. **6.** Характарыстыка Пане Каханку. **7.** Музычны твор, напісаны Міхаілам Ельскім пад уздзеяннем народнага танца. **8.** Беларускі народны танец, зафіксаваны ў канцы XIX ст. на Гродзеншчыне. Відаць, ад яго назвы ўтварылася моладзевае слова «балабасіць». **9.** Скульптар, аўтар мемарыяльнай шыльды мастаку Фердынанду Рушчыцу. **17.** Прадстаўнік народу, жыццё якога апісаў у аўтарскім дзённіку аб падарожжы праз Азію Юзаф Капец, ураджэнец Піншчыны. **18.** Яго песня «Да пакіньце горла драць» спявалася на сходах філаматаў у Віленскім універсітэце. **20.** Месца жыхарства асаднікаў. **21.** Першая сталіца незалежнай Літвы ў XX ст. **22.** Афтальмолаг, ганаровая жыхарка Мінску, медыцынскі брэнд Беларусі. **23.** Фолк-гурт, які ў поўным складзе зняўся ў фільме «Анастасія Слуцкая». **24.** Статус шляхціца з-пад Ляхавіч Тадэвуша Рэйтана на Вальным Сойме Рэчы Паспалітай у 1773 г., падчас якога ён заклікаў: «Не забівайце Бацькаўшчыны!». **25.** Восеньскае свята: «Прыйшоў ... — кідай рагач». **27.** Гліняны ці драўляны музычны інструмент флейтавага тыпу. **28.** У 1920-я Лукаш Калюга пераклаў з чэшскай мовы «Прыгоды ўдалага ... Швейка». **29.** Вымушаны спуск і прызямленне пацярпелага катастрофу самалёта, які пілатаваў Уладзімір Карват з Брэстчыны і які цаной свайго жыцця адвёў бяду ад населеных пунктаў. **34.** Галоўнакамандуючы карфагенскай арміі, з ім у Еўропе параўноўвалі Канстанціна Астрожскага. **35.** Спявачка з Веткаўшчыны, заслужаная артыстка Беларусі, у свой час была даверанай асобай Віктара Ганчара. **36.** Музычная спецыяльнасць Сымона, галоўнага героя паэмы Якуба Коласа. **37.** Шляхецкае прозвішча, характэрнае для Віцебшчыны. Яго меў майстар-беларус, прывезены ў Маскву ў 1660 годзе працаваць чаканшчыкам у Срэбранай палаце Крамлю, і адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Другую сусветную вайну. **38.** Полацкі князь-чарадзей. **39.** Удзельніца мінскага падполля, якая знішчыла гаўляйтара. **41.** Маладая ведзьма з твору Ф. Аляхновіча «Круці, не круці — трэба памярці». **42.** Краіна, дзе ў 1936 годзе быў арыштаваны разведчык Леў Маневіч, родам з Чавусаў, які з'яўляўся кіраўніком антыфашысцкай падпольнай арганізацыі ў канцлагеры Эбензе.

**Ала Адамайціс**

### Адказы

**Па гарызанталі:** 4. Верас. 10. Раманаў. 11. Качалаў. 12. Тарыч. 13. Галубок. 14. Сусанін. 15. Сібір. 16. Малевіч. 18. «Чытанкі». 19. Чужапанак. 26. Сховішча. 29. Порахава. 30. Акрабат. 31. Данцыг. 32. Карона. 33. Трактат. 40. Галушкіна. 42. Іканастас. 43. Агата. 44. Мікешын. 45. Яраслаў. 46. Упала. 47. Капітан. 48. Летапіс. 49. Мацяш.

**Па вертыкалі:** 1. Памазан. 2. Палубес. 3. Насовіч. 5. Езавітаў. 6. Арыгінал. 7. «Мазурык». 8. «Балабас». 9. Ваніцкі. 17. Чукча. 18. Чачот. 20. Асада. 21. Коўна. 22. Бірыч. 23. «Палац». 24. Пасол. 25. Багач. 27. Акарына. 28. Ваякі. 29. Пасадка. 34. Ганібал. 35. Гулевіч. 36. Скрыпач. 37. Андрэеў. 38. Усяслаў. 39. Мазанік. 41. Агапка. 42. Італія.

# Доктару Хаўзу ад беларускага народу

Адкрыты ліст.



Любы!

Ты — Брус Уіліс сёння. Як і яго, цябе можа кінуць жонка, могуць ненавідзець усе сябры, бо ты такі самы казёл, імпатэнт, алкаголік і няўдаха, але на самы апошні бой ты, як і ён, выйдзеш ды ўратуеш людскія душы.

Але ж, па справядлівасці, Брус Уіліс быў перадапошнім бойскаўтам, а апошні ўсё ж ты, мілы доктар. Проста ты адзін з першых — а дакладней, трэці — уцяміў, што ратаваць свет — гэта не прафесія.

Першымі гэта зразумелі нашы разумныя мамы і настойліва раілі паступаць на эканамічны. Другімі скемілі небаракі з задымленых вежаў-блізнюкоў, што, дарэмна прачакаўшы Супермэна, ад нявыкруткі скакалі долу. Рэч у тым, што для паўставання генерацыі свядомых ратавальнікаў свету патрэбныя спецыфічна-цяплічныя ўмовы: павільён, флуарэсцэнт і якасны мантаж. Таму, калі чацверты Рэмба глядзіцца як пародыя на першых трох, ты ўзяў ды паступіў у галівудскі медыцынскі. Пэўна, беручы ў аснову, што, ратуючы чалавека, — ратуеш цэлы свет. І ўсё ж застаўся сволаччу і паўдуркам.

Не вер галоўурачу Кадзі, не спі з падначаленай Камерон. Усе доктаркі — сцервы. Галівудзяць налева і фабрыкуюць мроі. Мы ж цудоўна ведаем, што ў цывільным жыцці ты — Х'ю Лоры, ангельскі актор. Не як яны янкі. Ты — глыбокі, удумлівы брытанскі комік. Наскі, еўрапейскі. Еўрасаюзнік!

Добры доктар Хаўз! Гэтае кубічнае неба колеру таплёнага малака і бурае падножжа з тэкстурай пракіслай аўсянкі. Два мінулыя пакаленні мы толькі тое і рабілі, што прасілі снег на Новы год. Сёлета атрымалі. Шчыра? Шчасця гэта не прыносіць.

Калі зноў прыадчыняцца нябёсы, дык паспрабуем заказаць два леты. Тое першае, вялікае і гнілое, як Грымпенская дрыгва, такой бяды — хай разлягаецца паміж майскімі і дажынскімі. Можа, яно яшчэ схамянецца ды зробіць нам прыемнае. А вось паміж лютым і сакавіком хай дадасца яшчэ адно лецейка: невялічкае, але каб выхад да трох мораў і адпускныя ў цвёрдых нафташэкелях з прывязкай да Госпада Бога. Каб нашым разумным мамам не давялося хадзіцьторкацца па абменніках. Ой, дзетачка-доктар, мама ж стары чалавек, хворы... А хварасць — гэта па тваёй медчасці.

Чаму менавіта цяпер, пры канцы лютага, пішам да цябе, добры доктар? Ведаеш, гэтай парой у нас абвастраецца поцяг да справядлівасці ды заканчваюцца боепрыпасы ў падвалах. Першае, кажуць, лечыцца, у другім бедстве навука робіць толькі першыя крокі. Але, ведаем, усё будзе: і тры ўраджаі на год, і бананавыя плантацыі ў дэльце Сожу, і з'езд беларускіх фараонаў у Палацы Рэспублікі.

Мілы Хаўз! У гэтым месцы хочацца прыгадаць які-небудзь беларускі верш якога-небудзь беларускага паэта, але ўспамінаюцца неўміручыя словы Някрасава. Такім парадкам, тэрмінова прымі эсэмэску з сімптомамі нашай хваробы:

Ліхаманка  
Я маю грудзі  
Губы бяскроўныя  
Павекі апалыя  
Ногі апухлі  
Каўтун у валасах.

Паводле пералічанага вышэй пастаў нам дыягназ. Дакладны, але добры. Бесстаронні, але з душою. Каб не горш за суседзяў але, каб, барані Божа, не вытыркацца. Каб з тваім смяротным выракам можна было жыць ажно да самай смерці. Сам бязлітасны, з нас злітуйся. Медзаключэннямі пра агульную млявасць і абыякавасць да жыцця просьба не турбаваць.

Метагалактычны авітаміноз?

Не!

Міжпланетны скаліёз?

Не!

Зборная Уругваю?

Не!

Маладзёжная Парагваю?

Не!

«Дынама» (Мінск)?

«Тарпеда» (Пінск).

Калі дачка?

Хай будзе Дыяна.

А як што сын?

Тады Даніла.

Сячэш паляну, медафіл?

А цяпер сур'ёзная прапанова. Усе дзевяць з хвосцікам мільёнаў грамадзян РБ купляюць сабе не па шэсць бутэлек піва, а па пяць з паловай, скідаюцца па зэканомленай тысячы — і бізнес-класам ты прыбываеш на «Белавія» ды ставіш нам клізму. Увесь такі ў белым і прасветлены пасля «Бхагавад-гіты» і «Рухнамы». Прыязна гутарыш з грамадскімі (пр)адстаўнікамі, малодшаму школьнаму ўзросту падрабязна адказваеш на пытанне, дзе былі ўсе дарослыя ў ноч на 37-ы год, перад кожным актам куплі-продажу ў ЦУМе цалуеш прадавачку ў псіхатэрапеўтычных мэтах. А яшчэ — разводзіш рукамі інвестыцыйны клімат, размінаешся з усімі замежнымі гандлярамі людзьмі.

Чаго, ты ўжо тут?! Каторы месяц ідзеш па БТ? Oh, my God! Яны што там, на Макаёнка, 9, усе з глузду паз'язджалі? Што яны маюць паказаць наступным нумарам: мультсерыял пра Садама Хусэйна?

Як ты ўжо тут, дык, будзь ласкавы, сатры з трэцяга вока кан'юктывіт, пастаў банькі сабе на рогі, наляпі гарчычнікі пад хвост, і вэк адсюль! Халера цябе не возьме, доктар Хаўз.

Падпісаліся:  
1. Павал Касцюкевіч  
2. ......................  
3. ......................  
4. ......................  
5.

**Ты адзін з першых — а дакладней, трэці — уцяміў, што ратаваць свет — гэта не прафесія. Першымі гэта зразумелі нашы разумныя мамы і настойліва раілі паступаць на эканамічны.**

**«Доктар Хаўз»**

амерыканскі серыял, які ўжо 5 гадоў трыумфальна ідзе на экранах свету, а летась дабраўся да БТ. Грэгары Хаўз, медычны геній і мізантроп, узначальвае каманду лекараў—дыягностаў. Эксцэнтрычны цынік трэціруе сяброў і галоўдоктара, прымае наркотыкі і падпускае расісцкія ды сэксісцкія шпількі на адрас падначаленых і начальнікаў, але разам з тым беспамылкова вызначае хваробу пацыентаў у самых заблытаных выпадках.

# «Пінская шляхта»

**Ці ёсць сёння розніца між шляхтай і мужыкамі? Пра засценкі Фартуны і Круглоніва піша Тацяна Барысік.**




Я ўсяго толькі зямлячка В.Дуніна-Марцінкевіча, адна з тысяч, і менавіта таму мушу выказаць сваю думку. «Пінская шляхта» — твор пра нас. Я гэта яшчэ ў школьныя гады зразумела, а цяпер, перачытаўшы п'есу, трохі пажыўшы на свеце, проста перакананa: гэта больш пра сучаснасць, чым пра сівую мінуўшчыну; хутчэй пра Бабруйшчыну ці Міншчыну, чым пра Піншчыну; аб штодзённым жыцці, асаблівасцях менталітэту буйнога слою тагачаснага грамадства — дробнай шляхты. Каторая насуперак артыкулам крытыкаў са школьнага падручніка, адрознівалася ад «мужыкоў».

Яшчэ ў падлеткавыя гады заўважыла — расповеды настаўнікаў пра жыццё беларускае вёскі на пачатку XX стагоддзя зусім не стыкаваліся, а то і пярэчылі бабуліным словам, успамінам старых аднавяскоўцаў.

Памятаю, як мая аднакласніца запыталася ў настаўніцы гісторыі:

— Шляхта, гэта хто такія?

— Гэта такія палякі, — адказала настаўніца ліцэю абласнога цэнтру. Я змаўчала, пярэчыць дарослым не прынята. Ды і без патрэбы. І так ведама, шляхта —ніякія не палякі, а жыхары вёсак Круглоніва і Фартуны Бабруйскага раёну.

Ужо пасля зразумела — мы не выключэнне з правіла, а малая частка слою колішняга беларускага грамадства, такіх вёсак было багата.

Пан прайграў у карты гэтую зямлю. Камусьці вельмі пашанцавала, адсюль у суседняй вёскі Фартуны такая назва. Зямлю набыла шляхта і пасялілася тут. У Фартунах жылі каталікі, у Круглоніве — праваслаўныя.

Міжволі здаецца — героі «Пінскай шляхты» пражылі тут увесь свой век і пахаваныя прад камянямі-помнікамі, пазначанымі трасянкаю царкоўна-славянскай і гутарковай беларускай мовы: «Здесъ пакоіцца раба божая Марыя», і крыжам, чамусьці часцей каталіцкім.

Недзе ў сярэдзіне 1990-х адбыўся выпадак, які ў Круглоніве, мабыць, і да таго эпізадычна здараўся і нагадваў сюжэт знакамітай п'есы. Ніна пасварылася з Валяй і абазвала яе «мужычкай».

У савецкія застойныя 1970—1980-я яшчэ можна было пачуць такое:

— От, мужыка ўзялі! — пацвельвалі нядобразычлівыя з нетутэйшага суседскага зяця, прасцякаватага ў абыходжанні хлопца, каторы бегаў па хатах гуляць у карты, падпіўшы, спяваў на вуліцы.

— Мужычку ўзяў, — бедавала фартунская бабуля, калі ўнук ажаніўся з дзеўкаю з Дворышчаў, суседняй «мужыцкай» вёскі.

— Паводле нашага шляхетнага звычаю... — казаў дзядок, праціраючы чаркі.

— Дробная шляхта нічым не адрознівалася ад мужыкоў, толькі ганарылася сваім паходжаннем, такія ж бедныя непісьменныя людзі — прыкладна так тлумачыў школьны падручнік па беларускай літаратуры.

— Ва ўсім адрозніваецца, нават мова іншыя, — цяпер, на пачатку XXI стагоддзя кажа мая маці, ураджэнка Круглоніва.

— Гэта зусім іншая культура, — распавядае, у цягніку едучы, выкладчыца універсітэту, маладая яшчэ жанчына, родам з-пад Любані, таксама з былога шляхецкага засценку.

Значыць, не такой малой была розніца, калі яна за гады савецкай улады не знікла. Што ўжо казаць пра паўтары стагоддзі таму.

Першае, што кідаецца ў вочы ў былых засценках — гаспадарчыя пабудовы паўсюдна аддзеленыя ад чалавечага жытла. Для быдла — асобны двор, за хатаю ці праз вуліцу. Расчыненыя дзверы хлява — а насупраць сенцы са зграяю мух — такога не ўбачыш.

Другое — гэта самі людзі, дакладней, пакаленне 80—90-гадовых, якое імкліва адыходзіць.

Прыгадваючы паводзіны нашых старых на бяседах дзесяцігадовай даўніны, дзівішся адсутнасці хамаватасці, мацюковых прыпевак. Мацюкацца наогул было не прынята.

Як хто зойдзе ў хату, абавязкова прапануюць прысесці, загадаюць маладзейшым падаць госцю стул, хоць госць і сам не хворы гэта зрабіць.

Людзі сталага веку больш адукаваныя ў параўнанні з маімі аднагодкамі. Сярод народжаных у 1910-1920-я — сярэдняя і няпоўная вышэйшая адукацыя не была рэдкасцю. Пісьменнымі былі і іхнія бацькі, дзяды. Надпісы на камянях і помніках пра гэта сведчаць. Дзе-нідзе ў Беларусі і цяпер на вясковых могілках крыжы нават на адносна нядаўніх пахаваннях не падпісаныя, а тамтэйшыя жыхары не лічаць гэта дзіўным:

— Старыя і так знаюць, хто дзе ляжыць.

У нас такога няма. Ледзьве бачна на камянях ці помніках царкоўнаславянскаю моваю або трасянскаю царкоўнаславянскай з гутарковаю беларускай саматужна выбіта імя, прозвішча памерлага, прыкладная колькасць пражытых гадоў і год смерці — канец або сярэдзіна XIX стагоддзя. Так што непісьменнасць шляхты — міф.

— Дык чым жа мужыкі ад шляхты розняцца? — запыталася я аднойчы ў бабулі дзеля цікавасці.

— Мужыкі на кладзьбішчах галосяць, а мы не.

Насамрэч, адметнасць у пахавальным абрадзе захоўваецца і па сённяшні дзень.

Па нябожчыках тут не галосяць і не галасілі ніколі, перажывалі гэта гора моўчкі.

Не ўбачым побач з трунoю і свечкай пляшку гарэлкі і віна, як пад Магілёвам здараецца.

Нябожчыка ідуць адведваць з кветкамі, увечары збіраюцца ўсёй вёскай, хто не здолеў прыходзіць глядзець памерлага раніцою, перад пахаваннем.

А гарэлку нясуць ужо на жалобны стол абавязкова, нават калі ты зусім не п'еш. Радня пакойнага запрашае на жалобны стол яшчэ на могілках. А на саракавіны запрашаюць людзей, кожнага асобна, загадзя зайшоўшы ў хату са словамі: «Просім на жалобны стол», называюць дзень і час. Запрашаць па хатах заведзена спрадвеку, інакш людзі пакрыўдзяцца і не пойдуць.

Стол павінен быць шчодрым, усяго ўдосталь, калі мала выпіўкі ці ежы, ніхто ўголас не скажа, аднак міжсобку абгаворваць будуць яшчэ доўга.

Таму старыя, баючыся словаў «Рабіў, рабіў, а лапы склаў — пахавалі як сабаку», яшчэ пры жыцці запасілі грошы, дошкі, тканіну, гналі самагон сабе на смерць.

Часта здаралася так: дошкі і тканіна на труну заставаліся некранутымі. Цяпер усё гатовае робяць.


Фартунаўскія шляхцюкі XXI стагоддзя.

# пад Бабруйскам

Прыгледзеўшыся да нашчадкаў шляхты, складаецца ўражанне, нібыта за паўтары стагоддзі іхняя ментальнасць не змянілася. Яны паранейшаму фанабэрыстыя, з заўсёдным жаданнем не быць абсеўкамі ў полі. Выстаўляць напаказ ганьбу, знявагу — недаравальна. Памятаецца, як Ціхан Пратасавіцкі гатовы быў даць 100 рублёў, каб, як станець лазой сячы, дыван падаслалі.

Дык і сёння, крый божа, суседзі даведаюцца пра тваю няўдачу. Весткі пра беспрацоўе ўнука, мёртванароджанае цяля, кепскія паводзіны сваякоў захоўваюцца бы ваенная тайна.

Ты мусіш выглядаць паспяхова, каб зайздросцілі.

Раней нават малых унукаў не пускалі ісці басанож у суседнюю вёску.

— Абуйце хоць шлэпы нейкія, а то яшчэ падумаюць, што няма чаго на ногі ўзуць.

Кожная паслуга павінна быць як след аддзячана. Пра пазычаную ношку сена, калісьці адданую дзедаўскую сячкарню памятаюць і нагадваюць доўгія гады, а то і ўсё астатняе жыццё.

На жаль, час няўмольны, старыя паміраюць, а з імі сыходзіць і спрадвечны лад мыслення, традыцыйная культура, губляецца мясцовы каларыт. Змяняюцца і людзі ў шляхецкіх засценках, якія засценкамі даўно не клічуць. На зробленую ласку забываюцца хутчэй. Імкненне быць лепшым набывае вычварныя формы. Кожны пнецца знайсці хаця маленечкую суседаву ганьбу і выставіць яе напаказ.

Сваё хаваецца ад староннніх паранейшаму пільна, і гэта не замінае выхваляцца з любой нагоды. Напаказ купляючы паболей ежы ў аўталаўцы, прыдумляючы байкі пра неіснуючыя поспехі і заможнасць дзяцей, унукаў.

— Што за людзі такія! Тры жмені попелу не вартыя, а сябе ставяць! — абураецца бацька, ураджэнец іншых мясцін, і тут жа прыгадвае сваю радзіму — і ў нас у Падзіры такія ж былі, таксама нейкая шляхта.

— Шляхта — дваране! Знаю я, якія тут дваране. Па дварах з працягнутай рукой ходзяць, — кпіць з землякоў аднавяскоўец.

— Ды не быў Дунін-Марцінкевіч у тым Пінску, ён пра Бабруйск пісаў, — неаднаразова чула я ад бабруйчанаў.

Схіляюся да думкі, што кажуць яны гэта небеспадстаўна.

Пінская гаворка — гэта яшчэ не доказ.

Напрыклад, каб вывучыць асаблівасці дыялекту на ўсходзе Магілёўшчыны, не трэба туды ехаць. Дастаткова мець некалькіх знаёмых адтуль і прыслухоўвацца да іх мовы. Урэшце нязвыклае: бярёза, Мысціслаўль, дзелаіць перастае чапляць слых.

Пасля можна напісаць твор пра той жа Бабруйск, узяць за аснову рэальныя падзеі, вядомых людзей, чыноўнікаў, настолькі лёгка пазнавальных, што бессэнсоўна змяняць імёны. А каб ніхто не пакрыўдзіўся, перанесці дзеянне ў Мсціслаўе або Шклоў, скарыстаўшы ўсходнюю магілёўскую гаворку. Дасюль розніцу паміж дакументальнай літаратурай і мастацкім творам разумее не кожны. Што ж казаць пра часы В.Дуніна-Марцінкевіча? Пра крыўдлівых шляхцюкоў, здатных, нягледзячы на жаданне выпіць і добра пад'есці, праігнараваць запрашэнне на саракавіны, калі яно не зроблена асабіста, а перададзена праз суседа?

«Пінская шляхта» — гэта твор пра нас сённяшніх таксама. А «Раскіданае гняздо» — не. Ідучы на вялікі сход ні халеры не даможашся. А занясеш гасцінчык патрэбнаму чалавеку — і ўсе пытанні вырашаюцца ўмомант.

Некалі ў 1990-я мы з дзядулем доўга не маглі выпісаць торфабрыкет.

То торфакрошку прапануюць, то ўвогуле не кажуць нічога ўцямнага.

Так бы і цягалася дарэмна ў горад, каб не бабуліна парада: «Танька, завязі смародзінаў. Я, памятаю, як паеду зубы лячыць, дык сяджу доўга ў калідоры, а калі смародзінаў завязу — дык адразу выклікаюць».

Паслухалася — 4 кг смародзінаў і торба белага наліву зрабілі сваю справу.

Як вярталася, то ішла па гравійцы з аўтобуса і адчувала сябе, на той час студэнтка ВНУ канца ХХ стагоддзя, шляхцюком Грышкам, каторы завёз асэсару двух зайцоў, тры пары цецерукоў і кадолбчык мёду. Хіба што гасцінец мой быў бяднейшы.

Дзяды і бацькі, мабыць, яшчэ часцей адчувалі сябе Грышкамі пры савецкай уладзе: неаднаразова, па кожнай дробязі.

З вуснаў у вусны перадавалася сага-ўспаміны пра нейкага пракурора, каторы ў пасляваенны час за гасцінчыкі ў памеры возу пшаніцы ад калгаснага кіраўніцтва прыкрываў і забойствы невінаватых, і буйныя крадзяжы. Куды там Кручкову!

Узгадайма:

— Ведама, юрыста — абдзярэ усіх дачыста ды й паедзе з богам дахаты.

Рэдка цяперашнім светам пачуеш такую трапную прымаўку. Але аднаго разу ўсё ж давялося.

У перадачы «Віншуем, жадаем» жыхар вёскі Забудзькі, што на мяжы Асіповіцкага і Бабруйскага раёнаў, жадаў долі сваяку: «Каб не знала ваша хата ні доктара, ні адваката!»

Ты мусіш выглядаць паспяхова, каб зайздросцілі.



У Круглоніве жывуць нашчадкі праваслаўнай шляхты.



Аўталаўка ў Фартунах.

**Фотаздымкі Юліі Дарашкевіч**



27 лютага ў «Рэактары» — канцэрт-вечарына «Ірландскія танцы» з удзелам гуртоў «Рагнеда» і «Басданс». **Пачатак а 20-й.**

# Ірландскія танцы

## ІМПРЭЗЫ

**Прэзентацыя кнігі Анатоля Тараса**

**26 лютага на сядзібе ТБМ (Румянцава, 13)** мае адбыцца прэзентацыя навукова-папулярнай кнігі Анатоля Тараса «Анатомия ненависти. Русско-польские конфликты в XVIII — XX вв.». Гэта працяг папярэдняй кнігі аўтара: «Войны Московской Руси с Великим княжеством Литовским и Речью Посполитой в XIV—XVII вв.». **Пачатак а 18-й.**

**Беларуская літаратура ў Маскве**

**19 лютага а 15-й у Доме расійскага замежжа (Ніжняя Радзішчаўская, 2) у Маскве** адбудзецца прэзентацыя сакавіцкага нумару часопісу «Сибирские огни», прысвечанага сучаснай беларускай літаратуры. Праводзіць вечарыну вядомы бард Віктар Шалкевіч. Сардэчна запрашаем усіх!

**Кіно пра беларускіх палякаў**

**21 лютага а 17-й у памяшканні Польскага культурна-асветніцкага цэнтру ў Брэсце** адбудзецца прэзентацыя і паказ кінастужкі «Палякі», прысвечанай жыццю польскай нацыянальнай меншасці ў Беларусі.

**Сустрэча з Антанінай Хатэнкай**

**23 лютага на сядзібе ТБМ** адбудзецца сустрэча з Антанінай Хатэнкай «Міфалагічныя матывы і метафізічны светапогляд у літаратуры XX стагоддзя». **Пачатак у 18.30.** Уваход вольны.

**Друкапісы. Вялікая імправізацыя**

**24 лютага а 18-й у Музеі гісторыі беларускай літаратуры** адбудзецца прэзентацыя факсімільнага выдання «Друкапісы. Вялікая імправізацыя», прысвечанага літаратурнаму авангарду ў Беларусі, што часткова адлюстравана ў эксперыментальным выдаўнічым праекце 90-х гадоў XX стагоддзя — так зв. «друкапісах», якія фактычна сталіся першай авангардовай перыёдыкай беларускай літаратуры. Уваход вольны.

## ВЫСТАВЫ

**Да 70-годдзя Чэслава Немэна**

**У Гродне** адзначаюць 70-годдзе з дня нараджэння музыканта і кампазітара Чэслава Немэна. У музеі Максіма Багдановіча працуе выстава фатаграфій і карцін, прысвечаных майстру, а ў абласным лялечным тэатры — выстава польскага джазавага плакату.

**Радзівілаўская мапа ў Гістарычным музеі**

**У Музеі гісторыі і культуры (Маркса, 12) да 1 сакавіка** працуе выстава «Дэманструецца ўпершыню», на якой паказаныя экспанаты з новых паступленняў у фонд музею: радзівілаўская мапа пачатку XVII ст., арнат з устаўкамі з слуцкага поясу XVIII ст., археалагічныя экспанаты, калекцыя нумізматыкі і сфрагістыкі…

**Вясельная выстава**

**Да 7 сакавіка ў Маладзечне** працуе «Вясельная выстава». У экспазіцыі скарыстаныя рэчы з фонду абласнога краязнаўчага музею. У дзень закрыцця выставы плануецца выступ фальклорнага гурту «Гуда».

**Выстава да Дня мовы ў Полацку**

**Да Міжнароднага дня роднай мовы (21 лютага) Музей беларускага кнігадрукавання ў Полацку** ладзіць выставу «Мова! Як сонца маё беларускае…». На экспазіцыі, якая будзе дзейнічаць на працягу трох месяцаў, можна ўбачыць мастацкія творы і даведачныя выданні, падручнікі і творы для дзяцей на беларускай мове. Асаблівую ўвагу прыцягваюць пераклады сусветна вядомых аўтараў Д.Дэфо, У.Шэкспіра, П.Мэрымэ, А.Пушкіна, Ф.Дастаеўскага на родную нам мову.

**Алтарны жывапіс XVIII — XIX стагоддзяў**

**23 лютага ў Мастацкім музеі** пачынаецца выстава «Алтарны жывапіс XVIII—XIX стст.», на якой можна будзе ўбачыць 33 творы рэлігійнага жывапісу з фондаў музею, многія з якіх экспануюцца ўпершыню.

**Беларусь на літаграфіях Орды**

**У гомельскім палацы Румянцавых-Паскевічаў да 29 сакавіка** працуе выстава «Беларусь на літаграфіях Напалеона Орды».

**Сабака і анёл**

**У Музеі сучаснага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 1 сакавіка** працуе выстава твораў Ілоны Лазоўскай «Сабака і Анёл».

**Паміж небам і зямлёй**

**У Палацы мастацтваў (Казлова, 3) да 29 сакавіка** працуе выстава твораў баранавіцкага мастака Алеся Фалея «Паміж небам і зямлёй», прымеркаваная да 50-годдзя аўтара.

## ТЭАТРЫ

**19 лютага (чацвер)**

**Музычны тэатр** — «Рускі фантом»
**Тэатр юнага гледача** — «А золкі тут ціхія»
**Тэатр лялек** — «Гісторыя аднаго гораду»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «...Забыць Герастрата!»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

**20 лютага (пятніца)**

**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Тэатр лялек** — «Чароўная лямпа Аладына»
**Опера** — «Мадам Батэрфляй»
**Музычны тэатр** — «Дон-Жуан у Севільі»
**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «...Забыць Герастрата!»

**21 лютага (субота)**

**Купалаўскі тэатар** — «Вяселле»
**Тэатр імя Горкага** — «Каштанка», «Нібыта хворы»
**Музычны тэатр** — «Буратино.by», «Прынцэса цырку»
**Тэатр лялек** — «Чароўная лямпа Аладына»
**Тэатр юнага гледача** — «Паліяна»
**Палац Рэспублікі** — «Іствікскія ведзьмы»
**Опера** — «Князь Ігар»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Галубчык»

**22 лютага (нядзеля)**

**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Тэатр лялек** — «Кот у ботах»
**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Балет** — «Чыпаліна», «Спячая прыгажуня»
**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»
**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Галубчык»

**23 лютага (панядзелак)**

**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Майстар і Маргарыта»

**24 лютага (аўторак)**

**Тэатр лялек** — «Сіняя птушка»
**Балет** — «Баядэрка»
**Тэатр імя Горкага** — «Адзіны спадкаемца»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Назаўсёды ў памяці»

**25 лютага (серада)**

**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр лялек** — «Балада пра Белую Вішню»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Поле бітвы»
**Опера** — «Іаланта»
**Тэатр імя Горкага** — «Я веру ў гараскопы», «Утаймаванне наравістай»

**26 лютага (чацвер)**

**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр лялек** — «Балада пра Белую Вішню»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Выкраданне Алены»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»
**Тэатр імя Горкага** — «Анджэла і іншыя»

**27 лютага (пятніца)**

**Купалаўскі тэатр** — «Тапольная завея»
**Купалаўскі тэатр** *(малая сцэна)* — «Маці»
**Тэатр лялек** — «Прыгоды алавянага жаўнерыка, пастушкі і камінара»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Вельмі простая гісторыя»
**Опера** — «Сельскі гонар»
**Тэатр імя Горкага** — «Перад заходам сонца»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»

**28 лютага (субота)**

**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»
**Купалаўскі тэатр** *(малая сцэна)* — «Дзікае паляванне караля Стаха»
**Тэатр лялек** — «Жудасны спадар Ау»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Вельмі простая гісторыя»
**Балет** — «Легенда пра Уленшпігеля»
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»

**1 сакавіка (нядзеля)**

**Тэатр лялек** — «Марозка»

**Пачатак спектакляў — 19.00.**

## КАНЦЭРТЫ

**Джаз**

**20 лютага а 19-й у Вялікай зале Філармоніі (пр.Незалежнасці, 50)** у межах Джазавых вечароў зайграе **Zbigniew Wegehaupt Quartet** (Польшча). Імпрэза пройдзе пры судзеянні Польскага інстытуту ў Мінску.

**Зміцер Вайцюшкевіч у Оршы**

**20 лютага** вялікі сольны канцэрт спевака і музыкі Зміцера Вайцюшкевіча адбудзецца



**ў Музеі Уладзіміра Караткевіча (Леніна, 26) у Оршы. Пачатак у 18.30.**

**Neuro Dubel**

**1 сакавіка ў «Гудвіне» (пр.Незалежнасці, 19)** — канцэрт Neuro Dubel. Квіткі: 15 000.

**Канцэрт памяці Курта Кабэйна**

**20 лютага ў «Рэактары» (Веры Харужай, 29)** — фестываль-трыб'ют NIRVANA, прысвечаны дню народзінаў Курта Кабэйна. Бяруць удзел **Zaniapad, «Мутнае Вока», «Голая Манашка», Determined, In Joy, LikBez, «Псіхоз». Пачатак у 17.30.**

**Экскурсія па гістарычным Гомелі**

**У нядзелю, 22 лютага, МГА «Гісторыка»** ладзіць у межах грамадскай кампаніі «Будзьма!» **экскурс па гістарычным Гомелі** разам з Яўгенам Малікавым, даследнікам гісторыі архітэктуры. **Збор а 10-й на ганку Драмтэатру.**






## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Аўстралія»

**Аўстралія** (Australia)

Аўстралія — ЗША, 2008, каляровы, 165 хв.

**Рэжысёр:** Бэз Лурман

**Ролі выконваюць:** Ніколь Кідман, Х'ю Джэкман, Брэндан Уолтэрз, Эдзі Бару, Браян Браўн, Дэйвід Уэнгам

**Жанр:** Эпічная драма

**Адзнака:** 7 (з 10)



Ангельская арыстакратка Эшлі (Ніколь Кідман) напярэдадні Другой сусветнай вайны прыязджае да мужа ў Аўстралію. Толькі муж забіты, ферму абкрадаюць — і трэба пераганць 2000 быкоў за сотню міляў у горад Дарвін. Дапамагчы бярэцца пагоншчык Дровер (Х'ю Джэкман). Але Аўстралія ўжо пад прыцэлам японскіх бамбардзіроўшчыкаў.

Карціна Бэза Лурмана — эпас, дзе спалучаюцца меладрама і камедыя, кадры вестэрну і шаманскія спевы, дэтэктыў і сацыяльная крытыка. Кактэйль, які мусіў быць несумяшчальным, — хаця і не без цяжкасцяў — удаўся.

Пейзажы пустыні — і раз'юшаны статак, які нясецца на маленькага хлопчыка; балі і свецкія плёткі; бомбы над горадам і любоў пад дрэвам; кенгуру; кінатэатр, абмыты даждом.

Аўстраліец Бэз Лурман зрабіў эпас пра краіну, якая нядаўна набыла і асэнсавала сваю гісторыю. Мы прызвычаіліся, што Аўстралія — гэта дзіўныя жывёлы, пустыні, каралавыя рыфы — райскае мястэчка пamерамі з кантынент. Але ў гэтым мястэчку разгортваліся свае жарсці.

Маленькі хлопчык, ад імя якога вядзецца апавяданне, — абарыген, метыс. Аўстралія не пазбегла расісцкіх забабонаў — і галівудскія героі годна змагаюцца з гэтымі забабонамі. Карціна дэманструецца ў Мінску, у кінатэатры «Беларусь».

**Андрэй Расінскі**

# «Белсат»: тэлепраграма на 23—1 сакавіка
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 23 лютага, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Ранча», серыял, 14 серыя
**19.05** «1945: год, які змяніў свет», дак. фільм, рэж. Гэбі Кент, 2005 г., Вялікая Брытанія, ч. 1
**20.05** Тыдзень з радыё «Свабода»
**20.35** Еўрасаюз без сакрэтаў
*Угрунтаваная на матэрыялах ад Еўрапейскай камісіі, праграма расказвае пра тое, як жывецца і працуецца жыхарам розных краінаў Еўрасаюзу.*
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.20** Хто ёсць кім: Кастусь Шыдлоўскі
*Кастусь ужо доўгі час — навуковы супрацоўнік Браслаўскага прыроднага музею. У пэўным сэнсе ён сам надаў гэтай установе цяперашнюю форму. Музей не мае статусу дзяржаўнага, аднак у ім сабраныя унікальныя звесткі пра Браслаўскі край.*
**21.40** «Інспектар-недарэка», маст. фільм, рэж. Клёд Зідзі, 1980 г., Францыя. У галоўнай ролі — Жэрар Дэпард'ё.
**23.20** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 17 серыя



**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 24 лютага, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 17 серыя
**18.55** YoLife! (моладзевая праграма)
**19.15** «Жыве Куба!», маст. фільм, рэж. Хуан Карлём Крэмата Мальбэрці, 2005 г., Францыя—Куба. У ролях: Харгіта Мілё Авіля, Малю Тараў Брочэ, Люіза Марыя Хімэнэс Радыгес.
*Харгіта і Малю — неардынарныя, адораныя фантазіяй, тэмпераментам і адвагаю закаханыя дзесяцігодкі. Паміж іхнімі бацькамі палымнее нянавісць, таму іх чакае растань. Але дзеці не здаюцца — яны вырашаюць збегчы з дому. Падарожжа праз усю краіну робіцца для іх цудоўнаю прыгодаю, а пошук уцекачоў стане для іхніх сям'яў і паліцыі вялізнаю праблемаю.*
**20.40** Асабісты капітал
*Праграма-параднік, якая распавядае пра спосабы найбольш эфектыўнага кіравання сямейным капіталам і пра магчымасці зберагчы сямейную ўласнасць.*
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** «Невядомая Беларусь»: «Як пушчу стралу», дак. фільм, рэж. Юрый Выдронак, 2008 г., Беларусь
*Старажытны паганскі абрад ператвараецца ў містэрыю з удзелам цэлай вёскі. Апошняй у Беларусі, дзе яшчэ існуе рытуал «Пахаванне стралы». Падчас абраду гучаць старадаўнія спевы. І пасярод выкання камера ў пэўны момант фіксуе раптоўны парыў ветру...*
**21.50** Ток-шоу «Форум»: Сэксуалізацыя нашага побыту
**22.35** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**23.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 18 серыя
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 25 лютага, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 18 серыя
**18.50** «Мой свет нарадзіўся ў кузні», рэпартаж, 2008 г., Беларусь
**19.10** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў у Літве)
**19.30** Падземка (беларускі хіт-парад)
**20.00** Рэпарцёр (публіцыстычная праграма)
**20.30** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** YoLife! (моладзевая праграма)
**21.35** «Без рэтушы»: «Чатыры сімвалы», дак. фільм, 2008 г., Беларусь
**22.10** Госць «Белсату»: перадача пра надзённыя праблемы Беларусі
**22.25** «Рок па вакацыях—2008», ч. 1
**23.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 13 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 26 лютага, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 13 серыя
**19.05** «Слёзы Шахеразады», дак. фільм, рэж. Егуда Джад Нээман, 2006 г., Ізраіль
**20.30** Кухня (музычная праграма)




**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.35** На колах: аўтамабільны агляд каналу «Нямецкая хваля»
**22.05** Інтэрнаўты выбіраюць
**22.50** «Мент», дэтэктыўны серыял, 14 серыя
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 27 лютага, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 14 серыя
**19.05** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.40** «Без рэтушы»: «Атамны Астравец», 2009 г., Беларусь
**20.05** Наша сцэна: канцэрт гурту «Тройца», ч. 1
**20.40** Беларусы ў Польшчы
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Госць «Белсату»: Сакрат Яновіч.
*Сакрат Яновіч — польска-беларускі пісьменнік, аўтар 30 кніг.*
**21.30** «Познань'56», маст. фільм, рэж. Філіп Баён, 1996 г., Польшча. У галоўных ролях: Міхал Жэброўскі, Тадэвуш Шымкаў.
*Познанец Філіп Баён распавядае пра гістарычныя падзеі чэрвеня 1956 г. — пра Пазнанскае паўстанне. Рабочыя з заводу Цагельскага (на той момант — імя Сталіна) выходзяць на вуліцы і патрабуюць абяцанага павышэння заробкаў. Ён паказвае тыя падзеі вачыма двух падлеткаў: Пётрэк — сын аднаго з правадыроў рабочых, бацька Дарэка — афіцэр УБ (польскага КДБ). 28 чэрвеня яны пасябравалі...*
**23.20** «Пітбуль», серыял, 15 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 28 лютага, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода»
**18.40** Кінастужка (агляд кінарынку)
**19.00** «Усмешка на вуснах ды слёзы ў вачах», дак. фільм, рэж. Ян Сасіньскі, 2008 г., Польшча
*У фільме расказваецца пра жыццё, шлюб і смерць, а таксама пра сяброўства і вернасць сабе і сваім ідэалам. Гэта падарожжа праз дзікія горы і спатканне з людзьмі, якія жывуць далёка ад цывілізацыі. З разумнымі і не вельмі, са здаровымі і хворымі. Важны кампанент фільму — музыка ўкраінскага гурту «Пэркалаба».*
**19.55** На колах: аўтамабільны агляд каналу «Нямецкая хваля»
**20.25** Кружэлка (сусветная музыка)







**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.20** «89 мм ад Еўропы», дак. фільм, рэж. Марцэль Лазіньскі, 1993 г., Польшча
*Брэст — горад на мяжы паміж Польшчаю і былым Савецкім Саюзам. Тут заканчваецца еўрапейская чыгунка, далей яна шырэйшая. Каб праз гэтае месца змаглі праехаць некалькі дзесяткаў міжнародных цягнікоў, беларуския працаўнікі вымушаныя кожны дзень мяняць некалькі тысячаў колаў пад вагонамі. З вокнаў цягнікоў на гэта глядзяць французы, немцы, галандцы... Два светы?*
**21.35** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.05** «Нават не думай», маст. фільм, рэж. Руслан Бальтцэр, 2002 г., Расія
*Першая моладзевая камедыя, пастаўлена ў стылі англійскай кінакласікі «Карты, грошы і дзве рулі» рэжысёра Гая Рычы. Першы з герояў фільму, галоўны ў кампаніі, — Марыё, «рэальны дзяцюк»; другі — Нік, каратыст і баксёр, які можа і пабіцца, і своечасова збегчы ад міліцыі. А трэці... Трэці проста свой хлопец...*
**23.30** «Жанчына з Украіны», дак. фільм, рэж. Павэл Лазіньскі, 2002 г., Польшча
*«Жанчына з Украіны» — камерны, цёплы партрэт спадарыні Лесі, украінкі, якая раз на тыдзень прыходзіць у дом да аўтара фільму, каб прыглядаць і прыбіраць. Гэта аповед пра самабытнасць, пра тугу па Бацькаўшчыне і пра патрэбу любові.*



**23.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 1 сакавіка, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд друку)
**18.20** «Ранча», серыял, 15 серыя
**19.10** Наша сцэна: канцэрт гурту «Тройца», ч. 2
**19.45** Жаўтуха (гумарыстычная праграма)
**20.10** «1945: год, які змяніў свет», дак. фільм, рэж. Гэбі Кент, 2005 г., Вялікая Брытанія, ч. 2
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Форум: Гендэр з намі! Адносіны палоў як сацыяльная праблема
*Ці існуе гендэрная роўнасць? Ці можа быць рэальная роўнасць паміж мужчынам і жанчынаю?*
**22.10** «Гэтыя і тыя», маст. фільм, рэж. Клёд Лелюш, 1981 г., Францыя, ч. 1. У ролях: Рабэр Асэйн, Джэральдына Чаплін, Даніель Альбрыхскі.
*Фільм паказвае лёс чатырох сям'яў з Масквы, Парыжу, Берліну і Нью-Йорку, якія пражылі нялёгкія 1930-я, вайну. Хаця героі з розных краінаў, іх у цэлае звязвае музыка. Гэта дало падставу ўключыць у фільм безліч музычных нумароў — ад савецкага балету да рок-шоу і мюзіклаў.*



**00.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Уся каралеўская раць на адкрыцці міжнароднай выставы-кірмаша «Кнігі Беларусі-2009». Рэпартаж. Старонка 9. Злева направа: Мікалай Чаргінец, міністр адукацыі і кіраўнік «Белай Русі» Аляксандр Радзькоў, Лідзія Ярмошына і намесніца міністра інфармацыі Лілія Ананіч.**

## ЖАРТ

Жонка і муж сядзяць у гасцёўні, гамоняць. Пакрысе гутарка выцярэбліваецца на тэму клінічнай смерці.

**Муж:** «Калі я, барані Божа, апынуся ў стане расліны і буду залежны ад электрычных прыбораў ды вадкасці, што будзе нетаропка заліваца ў мяне, — не вагайся, адразу адключы мяне ад усіх гэтых прыстасаванняў».

Жонка ўздымаецца, выключае тэлевізар і кампутар, выхоплівае з мужавых рук бляшанку з півам і выкідае яе ў сметніцу.

* * *

Мужчына звяртаецца да кіяскёра:

— Колькі ў вас каштуе бутэлечка «колы»?

— Чатыры тысячы.

— А чаго так дорага?

— Дзве тысячы бутэлечка і дзве — сервіс.

Няма чаго рабіць: мужчына працягвае патрэбную суму. Але прадавец вяртае яму дзве тысячы рэшты. Мужчына здзіўлены пытаецца:

— Навошта? Вы ж сказалі, цана — чатыры тысячы?

— «Колы» няма.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Усе сябры і паплечнікі з Маладзечна** і ўсёй Віленшчыны віншуюць Міхася Казлоўскага з юбілеем! Зычым здароўя, бадзёрасці, далейшых поспехаў у творчасці!

**Міхась Казлоўскі — файны дзядзька,** а тое, што ён робіць, — файны прыклад рэзультатыўнай дзейнасці нягледзячы на... Андрэй Мельнікаў

**Далучаюся да віншаванняў Міхасю Казлоўскаму.** Памятаю незабыўныя сустрэчы. Партызан

**Віншуем Міхася Казлоўскага.** Сябры з Вялейкі. Грышкевіч Дзімітры

**Kali Michas' vydau** svaju pierszuju knihu, to my vypivali razam za novuju kroplu u knizhnym mory. Zhadajem nakapac' pounuju stahramouku! Tvaje vilenskija subutelniki

**Міхасю К. і мая гратуляцыя.** Многая лета! Анатоль Сідарэвіч

### СПАЧУВАННІ

**Спачуваю сваякам Валянціна Тараса.** Блізка не быў знаёмы, але ўспаміны чытаў «узахлёб». Дастойны быў чалавек, сумленны. Ales' Jurkaviec

**Віталь, Антон, Лена — мае спачуванні вам.** Зараз вам цяжка. Трымайцеся... Фядута

**Шчыра спачуваем усім блізкім.** Заўсёды будзем памятаць Валянціна Яфімавіча як цудоўнага чалавека, пісьменніка, сцэнарыста і суседа па Лысай Гары. Сям'я Клімковічаў і Уладзіслаў Ахроменка.

**Тэксты спадара Валянціна** ўспрымаў як кіламетровыя ўказальнікі на дарозе. Дарога, хаця і цягнулася шмат гадоў, падавалася яшчэ доўгаю наперадзе. І раптам указальнікі скончыліся... Спачуванні ўсім, хто паважаў гэтага Чалавека. Андрэй Мельнікаў

**Віталь, прымі мае шчырыя спачуваньні.** Вінцэсь Мудроў

**Валянцін Тарас пражыў** на адзін дзень даўжэй за Васіля Быкава – і больш жыць не змог... Шчырыя спачуванні не толькі яго сваякам, а і ўсім нам — што сярод нас ужо яго няма. Лявон Баршчэўскі

### КВАТЭРА

**Прадам альбо памяняю** на Мінск ці Брэст пяціпакаёвую двухузроўневую кватэру ў пасёлку Мір Баранавіцкага раёну. Т.: (029) 570-80-88

### ШЧАНЮК

**Аддамо ў добрыя рукі** шчанюка. Т.: 571-62-88. Паўла

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

У Галіцыі (Аўстрыя), дзе жывуць украінцы і палякі, а таксама і ў Нямеччыне дробныя гаспадары не маюць коней; яны аруць і возяць каровамі. Дзеля нас — беларусаў — гэта пакажацца, можа, і смешным, калі хто адзавецца: «Янка, запрагай карову! Паедзем у мястэчка!..» У немцаў і ў Галіцыі спачатку таксама ўсе смяяліся з тых, хто ездзіў на карове. Але потым і самі змеркавалі, што з гэтага вялікая карысць і не трымалі коней.

**«Наша Ніва». №6—7. 1909**

**21 лютага**

# Міжнародны дзень роднай мовы

Гэтае свята ўжо 10 гадоў адзначаецца па ініцыятыве ЮНЭСКА. Яно мае на мэце захаванне моўнай разнастайнасці.

# Галоўны герой Аўстраліі

Жывёлінка, якая цудам выжыла падчас моцнага пажару і сама папрасіла дапамогі ў людзей, цяпер самы папулярны герой аўстралійскага інтэрнэту.




Падчас моцных пажараў у Аўстраліі пацярпелі не толькі людзі, але і жывёлы. Авечкі, кенгуру, каалы. Гэтага каалу пажарныя сустрэлі непадалёк ад мястэчка Мірбу Норт, што за 150 км на поўнач ад Мельбурну. Акурат па гэтых мясцінах і пракаціўся самы моцны пажар.

Каала бездапаможна стаяў пасярод пагарэлішча. Звычайна каалы рэдка спускаюцца на зямлю, цэлымі днямі бавячыся на дрэвах эўкаліптаў, ды па 16—18 гадзін спяць.

А гэты каала, пабачыўшы людзей, не ўцякаў і нават не шчэрыў на іх зубоў.

Пажарны даў каалу бутэльку з вадою. Звярок пачаў прагна піць, хоць каалы звычайна не п'юць вады — ім хапае вільгаці, што ўтрымліваецца ў эўкаліптах.

Каалу забралі і перавязалі апечаныя лапы. За яго адужаннем праз інтэрнэт сочыць уся Аўстралія.

**Паводле wyborcza.pl**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5475. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 10.02.2009.
Замова № 893.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
Цана дамоўная.

ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

9771819161008 09007